КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ І ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

Кніжка 2 (15) 1938 г. Год IV

МАКСІМ ТАНК

КАЗКА ПРА МУЗЫКУ

I.

За борам цёмным, вялікім,
дзе зачапіўшыся за сасновы грэбень
калышыцца сіняе неба,
жыў сірата-Музыка.
Ня меў ён ні двара, ні гароду,
сярмяжку толькі старую —
прыкрыцца калі непагодай —
і жалейку жывую.
А іграў ён заўсёды весела,
нат дрэва пачуўшы яго, —
хоцьбы найніжэй чупрыну зьвесіла, —
зашуміць-засьмяецца,
атрасаючы пыл;
закалышыцца вецер
і заскачуць як зайцы на полі снапы.
А што ўжо казаць пра людзей!
Хоць жыцьцё незавідным было,
а з Музыкам хацелася жыць і жыць...
Вось які з яго быў чарадзей!

Далёка, дзе сонца хаваецца,
а мо і яшчэ далей,
жыў Цар у палацы вялікім.
Ён пачуў ад бывалых людзей,
што на сьвеце ёсьць гэткі Музыка. —
Загадаў Музыку таго прывясьці,
у палац, на царскія вочы.
Прывядуць, — усіх азалоціць,
а то — лепш і дамоў ня йсьці...
Ішлі слугі Цара дзень і ноч,

пры сонцы, пры месяцы высокім, —
то лесам, то полем, гарой,
то сухадолам глыбокім.
Аж пачулі: нехта недзе грае,
толькі дзе і хто — ня відзяць,
хоць ідуць на дзіўны голас краем
ужо цэлы тыдзень.
Адзін кажа: можа гэта здань?
Другі: — мо трава сьпявае?
Толькі трэці, прылажыўшы вуха,
кажа: братцы, тут зямля такая!..
Можа лепей пойдзем да ракі,
ды спытаем, што такое?
Бачу я, — пад лесам рыбакі
ловяць сонца ў вадапоі.
Аж глядзяць — насустрач ім ідзе
у лапцёх лазовых хлопчык невялікі.
Вось паслы ў яго пытаюць: дзе
ў вас жыве такі Музыка?
Выняў ён жалейку ды зайграў, —
толькі зазьвінела рэха борам,
разьлілося шумам траў,
высыпалі песьню слухаць зоры...
Тут усе пазналі, хто прад імі.
Вось паслы і кажуць: хоча Цар
адкупіць жалейкі гэтай чар
разам з песьнямі жывымі.
А Музыка кажа: бедны мы,
сам я голы, як калок у плоце.
Можа ваш багаты гаспадар
наша ўсё каменьне пазалоціць,
але я жалейкі не прадам,
ні зашто яму, ніколі.
І пайшоў Музыка ў даль,
ў даль сінеючую, ў поле.

2.

Доўга радзілі паслы
над сваей бядой-няшчасьцем.
Парашылі, што жалейку
трэба ім украсьці.
Скураной дарожнай торбай
з іх патрос адзін:
з торбы выляцела Птушка,
паднялася ў сінь.
А другі на мокры дзёран,
з сьвіткі рукава,

вытрас Цень кудлаты, чорны, —
ні воўк, ні сава, —
аж здаецца пацямнела
неба, зелень траў...
Трэці... Гадзіну з запазухі дастаў.

Вось адзін пасол гавора
Птушцы: — Ты ляці,
дзе лускою серабрыстай
Нёман зіхаціць,
дзе купаецца зялёны
вецер у траве... —
там здаецца гдзесь Музыка
ў тым краю жыве.
Цені кажа:—Пойдзеш полем,
згасіш ясны дзень
і зблытаеш сьцежкі зораў
з сьцежкамі людзей.
Кажа Гадзіне:—Як толькі
край задрэме ўвесь,
да Музыкі па жалейку
ціха папаўзеш.

Над ракою зьвісла жыта
і клён малады.
Сьпіць Музыка пад ракітай,
ня чуе бяды,
што лягла нямая ціша
на палі, лугі;
што над ім блытае Птушка
чорныя кругі;
што апала ноч глухая
і па дзеразе
да яго на скат пясчаны
Гадзіна паўзе.
Сьніцца сон яму, што быццам
ружавее даль,
і пяе і залаціцца
ў Нёмане вада.
Бача дзіва: Цар ў палацы
ў золаце сядзіць,
сьмяючыся на Музыку
весела глядзіць.
Выпіў коўш альховы мёду,
выцер бараду,
і зайграў, ды на жалейцы,
ці-ра-ра... ду-ду...
Скочыў да Цара Музыка.

Зьнік раптоўна сон,
толькі шолах мокрай вікі
і калосься звон,
і ў траве шум чуе нейкі,
там, дзе яру скат...
І... за пазухай жалейкі
не знайшла рука...

3.

На курган рагамі вострымі
апёрся ясны месяц.
Йдзе дарогаю Музыка,
галаву на грудзі зьвесіў.
Ўсіх пытаўся: Можа бачыў,
можа чуў хто пра зладзеяў?!..
Але вечарам апошнім
нават вецер спаў, ня веіў;
камары ў густых чаротах
не снавалі з звону сільля,
нават сломка ціхім лётам
не абмыла сваіх крыльляў,—
толькі сьвечку запаліўшы,
сьветлячок адзін на дзіва
із-за папараці бачыў—
штось паўзло па сонных нівах...
Яшчэ бачыў нешта вожык,
але што? — і сам ня ведаў...
Распытаўся іх Музыка
і пайшоў на захад сьледам.

Доўга йшоў...Аж бача,—ў полі
ходзе па ральлі Араты
і з сяўні шырокай сее
жменяй чорныя зярняты.
Зацікавіўся Музыка
і Аратага пытае:
—Што ты робіш гэта дзядзька?
—Потам, сынку, засяваю...
Ды пытае у Музыкі:
Куды йдзе, з якога краю?
На дарогу даў у торбу
хлеба чорнага акраец.
Цэлы дзень ідзе Музыка.
Ізноў дзіва спатыкае:
Волат горы кіркай зносіць
і з далінамі раўняе.
Прывітаўся з ім Музыка,

пра няшчасьце сваё кажа...
А на гэта яму Волат:
—Што-ж, пайдзём з табою разам.
Пазаву Асілка брата.
На другім канцы разоры
ён сядзіць і днём і ноччу,
ўе пяньковыя аборы, —
каб разьвесіць ўсюды сільля,
і за лета і за восень
зьнішчыць птушак пералётных,
што пустуюць нам калосьсе.
А ён хай пакліча Вяля, —
ён стаіць дзесь за папарам,
разганяе дратаванай
пугай стада сівых хмараў...
У запас набралі лапцяў
і крануліся пад вечар
у далёкую дарогу,
торбы ўськінуўшы на плечы.

Падыйшлі да сіня-мора.
Мора дрэміць, серабрыцца...
Толькі аднаму Музыку
ноччу месячнай ня сьпіцца.
Чуе, на шляху паднебным
гусі дзікія гавораць
пра прапаўшую жалейку,
пра бяду яго і гора, —
што на родных яго нівах
і над Нёмнам яго слаўным
ня чуваць ніякіх песьняў,
не сьмяюцца людзі даўна...
І задумаўся Музыка...
Гусі крумкаюць-гавораць:—
за трохтысячнаю хваляй
востраў ёсьць на сінім моры...
Цар спраўляць задумаў сьвята,
мёд па чарах паліецца,
будуць на зачараванай
расьпяваць, іграць жалейцы...
— І мяне з сабой вазьміце!... —
Ды ня чулі гусі крыку.
Толькі збуджаная хваля
пенай пырснула ў Музыку.

4.

Яшчэ ноч дрэміць сіне-глуха.
Таварышоў Музыка будзіць

і кажа ім пра тыя весткі,
што ён ад Выраю падслухаў.
Рашылі: трэба секчы сосны,
хутчэй зьбіваць вялікі плыт
і хоцьбы месяцы ці вёсны,
а на далёкі востраў плыць.
Шуміць бор цёмны, уздыхае.
Кіпіць работа, звон удараў.
Гатова мачта смаляная,
на ей з кашулі белы парус.
І толькі збуджанае сонца
лоб медны падняло над логам —
плыт ціха па гладкой затоцы
крануўся ў дальнюю дарогу.
Вяслуюць ўсе, ды толку мала: —
прачнуўся раньні вецер шэры,
насустрач гоніць вал за валам,
ізноў варочае на бераг.
—Зацяжак плыт, — Асілак кажа,—
хай едзе Вяль адзін, з Музыкам,
каб не зьмяла іх бура часам —
няхай сябе прывяжаць лыкам.
А сам пайшоў на бераг з братам,
ляглі грудзьмі на жоўты ўзгорак,
і проста ў твар вятроў кудлатых
дзьмуць пачалі на сіне-мора.
І мора грозна застагнала,
на сонца плёснула, ўскіпела;
з вясельлем дзікім стада хваляў
плыт панясло на грывах белых...
Мінаюць дні, то ў моры тонуць,
то устаюць агнём зары.
Глядзіць Музыка з Вялем ў тоні,
і на каралі, і на рыб;
на груды пэрлаў і каменьняў,
на вадаростаў сьвет багаты,
і на затопленыя лодкі
купцоў, ваякаў і піратаў.
Над галавой, пад аблакамі,
кружыць арол з ахрыплым клічам.
Мо што згубіў ў баю з вятрамі,
ці ўбачыў сьвежую дабычу?
Ды адлятае без абеду
за вадзяныя горы-хвалі,
і толькі доўга яго сьледам
ўглядаецца Музыка з Вялем.

Гавора Вяль: — Здаецца востраў
я бачу,—а мо гэта сон?—
сьцяной залочанай і вострай
абнесены з усіх старон.
Бліжэй пад'ехалі і бачаць—
зялёны, дзіўны край зямлі.
Куды ня глянь — стаяць палацы,
а ў порце мачты, караблі;
шуміць народ, пяе, сьмяецца;
па цэлым беразе пакатым
вясельле чаркамі ліецца, —
гуляюць: Цар спраўляе сьвята.
Сядзіць сам высака на троне,
міністраў сем трымае бруха,
ў брылянтах, ў янтарох карона
цяжкая зьехала на вуха.
А слугі сьпераду і з-заду
кругом стаяць напагатове,
каб выпаўняць Цара загады.
На белых, на сталох дубовых
з вазёр і мора рыбы сьвежай;
зьвяроў, хлябоў і птушак дзікіх
з Палесься нетраў, з Белавежы...
аж не надзівіцца Музыка!

Гавора Цар: пара ўжо сяньня
гасьцей-бы чым разьвесяліць...
І вось да трону з прывітаньнем
падходзяць царскія паслы.
—Зайграем, кажуць яны, тое,
што самі струны запяюць...
Аж анямеў Музыка з болю,
жалейку ўбачыўшы сваю...
На цэлым беразе зялёным
ўсё змоўкла —цішыня нямая.
Ды ня чуваць чароўных тонаў...
Маўчыць жалейка, ня іграе.
Ўзлаваўся Цар:—эх, вось дык штуку
мне прынясьлі з якогась краю!
Няўжо-ж ніхто ня збудзіць гукаў,
ніхто на ей не заіграе!?
Маўчаць. Спусьцілі ўсе галовы.
І калі Цар другі раз клікаў, —
наперад, у лапцёх ліповых,
з кійком праціснуўся Музыка.
Узяў жалейку і —шчасьлівы —
ацёр палой сярмяжнай з пылу...
На ўсе лады і пералівы

яна ў яго загаварыла: —
то звонам жаваранка ў жыце,
то салаўіным сьвістам чулым,
трывожнай кнігаўкай ў ракіце
і ў лесе шэраю зязюляй;
а посьле доўга жнеі пелі,
чупрыніў вецер з стрэх салому,
сівыя хвалі Нёмну пеніў
і абарваў акордам грому...
А рэха ўсё яшчэ іграла
і змоўкла ў дальніх нетрах бору,
тады, калі Музыка з Вялем
дабеглі ўжо да сіня-мора.
Схапіўся Цар:—Хутчэй вярніце,
пагоню шліце за пагоняй!...
Але, як кагарка ў блакіце,
з кашулі белы парус тоне.

5.

Кажа раз Асілак брату:
—Глянь, дзе хвалі косіць шторм,
ці то грывай вал дзесяты,
ці то зломаным крылом
птушка тонучы махае?
— Не, ня хвалі там іграюць,
ня крылаты ўзмах птушыны,
але парус ў моры сінім!...
Кажа зноў Асілак брату:
—Глянь на сонечны загар,
быццам коней ляціць стада,
з шумам, з навальніцай хмар!
— Эх, ня хмары і ня коні
вадзяныя пенюць горы,
але царская пагоня
паказалася на моры!

Стогне вецер, вые дзіка,
круціць хвалі валам шэрым.
Ужо бача Вяль з Музыкам
бор сасновы — дальні бераг.
Яшчэ вёсламі ударыць.
Мачта хіліцца на бок.
Плыт ўразаецца ў пясок,
зьвесіў крыльля мокры парус,
на ім пены самацьветы...
Вяль Музыку так гавора:
—Мы гасьцей з-за сіне-мора

прывітаем без цябе тут.
Хопе ўсім сталоў—курганаў,
мёдам абнясём ліповым.
Хай даруюць, калі п'яна
з плеч пакоцяцца галовы,
ці у скоках пад нагамі
трэснуць панцыры іх, шлемы...
Ты йдзі польнымі шляхамі,
дзе над Нёмнам вербы дрэмяць,
дзе шумяць прасторы жыта
ў залатым, імглістым цьвеце.
Ўсё, што бачыў - раскажы ты,
перадай ім на жалейцы.
Разышліся. Вяль з братамі
ловіць мора сіні подых,
а Музыка йдзе шляхамі
і далінамі усходу.
Ўжо ў зялёных травах тоне,
ўжо закрылі яго межы,
толькі ўсё жалейкі тоны
разьліваюцца ў бязьмежжы.

А тымчасам у затоку
плывуць грозна параходы
і на бераг, на шырокі
Цар з дружынаю выходзіць.
Вось ён выступіў наперад.
Кажа: - Гніцеся у пояс!
Сплёў пусты для вас я нерад,
каб цягнуць да вадапою.
Лепей самі аддавайце
і жалейку і Музыку,
а то з вас сабе на лапці
надзяру мяккога лыка!
І хахоча ўся дружына.
Вяль гавора:—Што хваліцца!
Паглядзім, хто у даліне
устаіць ці ляжа ніцам...
—Што, няўжо-ж на вас, на гэткіх,
маей пстрычкі будзе мала? —
Ізноў разам Цар і войска
і паслы зарагаталі.
Посьле раптам змоўклі злосна
і пайшлі ўсе хмарнай сілай...
Вырваў Вяль з карэньнем сосну,
пояс патужыў Асілак,
Волат кірку зьняў з-за плечаў
і... спаткаліся з навалай.

Пачалі мясьці і секчы,
толькі рэха застагнала.
Быццам жнівам на іржышчы —
сноп на сноп — кладзецца сіла.
Цэлы дзень грыміць ігрышча.
Як стагі растуць магілы.
Наступае вечар сіні.
Ў місцы мора сонца тае.
Цёмна. Волатаў з дружынай
разьдзяліла ноч глухая.
Разышліся. Цар ля мора,
Вяль з братамі за курганы,
каб як згаснуць толькі зоры
заўтра зноў спаткацца рана.
Сьпіць зямля. Смугою ліпкай,
цёплым ценем сон ліецца,
толькі часам ціхай скрыпкай
заіграе польны вецер.

Хоць, нукае Араты,
цягне конь залёгшы шчыра
і сярэбрацца нарогі,
ад пяску сырога жвіру.
Часам сталь скрабне паліцу,
часам пырсьніць іскрай крэмень...
І хаваюцца пад дзёрнам
пікі, панцыры і шлемы,
чарапы галоваў, косьці...
Колькі Вяль з братамі выбіў!
Загулялі ўчора госьці...
Ну, раўней лажыся, ськіба!
Зааром, забаРануем,
ссыпем ядраны насевак
і запенящца ўраджаі,
закалышуцца напевы

Толькі дзень замятусіўся,
Вяль прачнуўшыся гавора:
—Што за дзіва, дзе ні глянеш, —
ўсё барозны ды разоры!
І на захад і на поўнач
зачарнеліся бяз краю;
ня відаць сьлядоў ўчарашніх,
нават месца не пазнаеш...
Паглядзелі і рашылі
падплясьці, падправіць лапці,
на пакінутыя нівы
у дарогу выбірацца.

Сонца залатой пагодай
дываны жытоў абмыла.
Сеў Музыка каля броду,
пад бярозаю пахілай.
Думу думае маркотны:
—Ці жывы гдзе Вяль з братамі?
Можа хмарай пералётнай
і кудлатымі вятрамі
косьці беляцца на нівах,
сном асмужаных, шырокіх,
дзе ўсе песьні — шум прыліву,
і маркі салёны рокат.
Лятучы з краёў заходніх,
Гругал кружачы гавора:—
Ой, лягло палова войска,
войска царскага з-за мора...
А стары Крумкач над Нёмнам
кінуў вестку хвалям сінім:
—На барознах ноччу цёмнай
доўга Цар блудзіў з дружынай.
Ўсюды ськібы, гдзе ня пойдзе, —
ціш і толькі шопат зорны...
На ральлі бязьмежнай, чорнай
няжывы абоз іх знойдзен...
І штось ярка ў Нёман кінуў.
Паглядзеў Музыка ў тоні.
Таіць там красою дзіўнай
камень выдзярты з кароны...
І вясёлкамі зазьзялі
воды сінія, здаецца;
самі тоны заігралі
ў зачарованай жалейцы: —
ціхім шопатам крынічным,
шумам трысьнікоў зялёных,
медным коласам пшанічным,
васільковым звонам лёну,
рэхам збуджаным, вясёлым,
казкай даўняй над калыскай...
Ўсё здаецца: нівы, сёлы
нехта гукамі апырскаў...
А кругом красуе лета,
дрэміць вецер ў полі роўным;
сонца сьпелаю ранэтай
наліваецца над Нёмнам.

Вільня, 19.II.38 г.

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

Я прышоў да вас зноў

Ябрусом расьцілаецца поле ізноў,
ператканае сонцам і зеленьню.
Доўга, доўга калышыцца скрып званякоў
ў далі цьветам вішнёвым забеленай.
Тыя-ж песьні, што чуў яшчэ хлопцам малым —
і цяпер зьвіняць — недапяяныя —
і ў іх жалю ўсё той беларускі палын,
недапіты дзядамі — падданымі.
Як раней, у вячэрні, ймгляны небасхіл
стада стрэх плыве недзе на россашы —
нібы ў просіні той, дзе бярозаў шляхі,
край ніводнай сьлязою нязрошаны.
Я прыйшоў да вас зноў, сонца, вёска, лугі, —
як спаткаеце госьця сягоньня?
Хоць даўно тут ня быў, хоць цяпер я другі, —
мазалі і ў мяне на далонях.
Госьць я ў вас—нечаканы, няпрошаны мо', —
ды з сабою прынёс я вам нешта: —
многа ёсьць у мяне зацьвітаючых слоў
і агнёў — казак роднага места.

* * *

Цяпер у нас засекі поўныя песьняў,
і пеніцца хмель у каўшох — хоць зьнімі. —
Вось так-бы чупрыны нам, хлопцы, тут зьвесіць
на гэтыя песьні, на гэтыя дні...
І глянуўшы ў рань нашых песенных ніваў,
у рунь нашых рыфмаў і словаў запен, —
пайсьці ізноў далей на новае жніва,
да новых, ядроных, нязнаных паэм!
Ня будзем іграць мы на жаласнай дудцы,
калі у нас столькі задору цяпер, —
нам струны ад песьняў навесістых гнуцца,
хай чуе ўвесь сьвет наш магутны канцэрт!
Чакаюць нас ясныя раніцы песьняў,
і далі у сонцы гараць без граніц, —
цяпер-бы чупрыны нам, хлопцы, тут зьвесіць
на буйныя песьні, на буйныя дні.

УЛАДЗІМЕР ЧЭМЕР

Вялікі скарб нашай старасьвеччыны

(750 угодкі »Слова аб палку Ігаравым)

I.

У канцы мінулага году сьвяткаваліся, праўду кажучы, даволі малагучна, 750-тыя ўгодкі нарадзінаў паэтыцкага твору, які з гонарам можа вытрымаць параўнаньне з найвялікшымі пэрламі сусьветнай мастацкай літаратуры. Мы кажам аб старарускай паэме XII веку, ведамай пад назовам „Слова аб палку Ігаравым."

Угодкі гэныя прайшлі так нягучна таму, што ўсе мы, усходнія славяне, не навучыліся яшчэ цаніць і шанаваць ні сябе, ні свае нацыянальныя скарбы, памяткі сваей слаўнай ці сумнай мінуўшчыны. Таму гэная поўная багацьця мінуўшчына, якая жыве ў гэтых памятках, *ня жыве ў нас саміх,* не ўзбагачывае сваімі скарбамі нашае душы, не ўскрашае ў нашай сьведамасьці гэнай мінуўшчыны, не зьвязывае з ей нашай сучаснасьці ў нейкае *адзінае ў часе і прасторы — вялікае цэлае, у вялікі гмах— „грамаду“* (Купала) *гістарычнага народу, культурнае нацыі.* Мы жывём у сваей большасьці, як нейкія, як кажуць расейцы, „Іваны непомнящіе,“ не памятаючы свайго ўчарашняга дня, нават свайго запраўднага імя і прозьвішча... Таму мы й ня маем у сваей душы тае вялікае, трывалае і моцнае апоры, якую дае народу сталая духоўна - органічная сувязь з роднай мінуўшчынай. Таму, жывучы з дня на дзень, *мы ня жывём яшчэ, як народ, жыцьцём культурна-гістарычным, нацыянальнай гісторыяй.* Таму наш беларускі народ ня стаў яшчэ *нанова* тым, як кажуць, *культурна-гістарычным народам, якім ён быў — можа першы з усіх усходніх славянаў — у сваей мінуўшчыне...*

Шмат ёсьць шляхоў для кожнага народу, каб стацца вялікай культурна-гістарычнай нацыяй. Але яны ўсе, гэтыя шляхі, зыходзяцца на адным — на шляху *самастойнага творства ў тых ці іншых палетках сусьветнай, агульна-чалавечай культуры.* Але ўсялякае творства наагул магчыма толькі на грунце *нацыянальнай самастойнасьці народу, якая вытвараецца ў яго гісторыі.* Таму — першым шляхом для адраджэньня нашага народу, для адбудаваньня ім гэнае свае ролі каваля свайго ўласнага лёсу, тварца агульна-чалавечых цэннасьцяў, зьяўляецца *навязаньне гэнай парванай у нас сувязі з роднай мінуўшчынай.*

II.

Дамо-ж цяпер нашым чытачом дакладнае паняцьце аб гэтым творы.

Насамперш — некалькі слоў аб тым, як, дзе і калі знойдзены быў самы гэты памятнік.

У 1795 г. ведамы ў сваім часе расейскі асьветны дзеяч гр. Мусін-Пушкін знайшоў у м. Яраслаўлі рукапісны зборнік, якім паміж іншымі, популярнымі ў свой час, творамі, было і „Слова." Поўны тытул яго гучэў так: „Слово о пълку Игоревѣ Игоря Святославля, внука Ольгова." Ужо з гэтага назову відаць, што твор пісаны быў у мове вельмі блізкай да *царкоўна-славянскай* (стара-баўгарскай), якая ў гэныя часы была, як ведама, мовай літаратурнай на ўсім абшары ўсходняга славянства.

Сьпісак „Слова," знойдзены Мусіным-Пушкіным, напісаны быў так званым „полу-уставом," на падставе чаго, а таксама на падставе цэлага чароду фонэтычных і морфолёгічных асаблівасьцяў яго мовы, знаўцы адносяць рукапіс да XV—XVI в., не раней. На вялікі жаль, мы ня толькі ня маем ранейшых сьпіскаў „Слова," але нават гэны, пазьнейшы, напісаны тры-чатыры вякі пасьля ўлажэньня твору, згарэў у 1812 годзе, у часе вялікага маскоўскага пажару, узьнікшага на спатканьне Наполеона. Захавалася толькі копія, ці адпіс, гэнага сьпіску, зробленая, праўда, найлепшымі, як на тыя часы, знаўцамі палеографіі, але-ж праверыць дакладнасьць іхняга адпісу, паводле вымаганьняў сучаснае навукі, сталася немагчымым. Захавалася і тагачаснае друкаванае выданьне „Слова," з перакладам на расейскую мову, зробленае ў Маскве ў 1800 г.

З гісторыі нашых старадаўніх багаслужэбных кнігаў мы ведаем, як шмат рабілася перапішчыкамі ў іх памылак. Асьвета наагул, нават у манастырох, стаяла на нізкім роўні. Таму незразумелыя ўпоўні рэчы, аб якіх пісалася ў кнігах, да таго-ж *чужая*, хаця ў значнай меры і зразумелая для „асьвечаных людзей" кніжная мова, — усё гэта вельмі спрыяла памылкам пры перапісцы.

Памылкі гэныя, аднак-жа, маюць і нікаторую карысьць для навукі. Справа ў тым, што перапішчык, жыхар таго ці іншага дыялектычнага (моўнага) абшару, мімавольна ўносіў у сваю працу асаблівасьці яго жывое мовы. І вось, калі асаблівасьці *пісьма*, графікі, непамыльна сьведчаць аб *часе* старадаўняга рукапісу, дык з *памылак у мове*, якія зрабіў перапішчык, можна часта зрабіць няменш пераконываючы вывад аб *мейсцы*, абшары, дзе зроблены быў сьпісак. Фонэтычныя асаблівасьці сьпіску „Слова" сьведчаць аб тым, што ён паходзіць з *Пскоўшчыны*, якая, як ведама, зьяўляецца найбліжэйшай „дыялектычнай суседкай" беларускага моўнага абшару, прынамсі з боку вялікарускага.

Такім чынам, пасярэдніцтва сьпіску XV ці XVI в., даючы указаньне на месца паходжаньня *сьпіску*, не дае магчымасьці дакладна судзіць аб абшары, на якім ўложана было самае „Слова." Затое — *зьмест* гэтага памятніку дае на наша пытаньне блізу зусім точны адказ. Да гэтага зьместу яго мы й пяройдзем.

III.

У ваўсіх старадаўніх паэмах быў, як ведама, звычай пачынаць гутарку зваротам да таго ці іншага высокага „патрона" паэзіі — на небе ці на зямлі.

Так і аўтар „Слова" зьвяртаецца напачатку да нейкага „Баяна," свайго слаўнага папярэдніка. Гэны Баян, асобу якога некаторыя дасьледчыкі лічаць легендарнай, жыў, калі верыць аўтару „Слова" дый параўнаваць яго словы з хронолёгіяй летапісаў, гадоў за сто да яго. Характэрна, што аўтар неяк двойча адносіцца да гэнага свайго слаўнага „патрона" і папярэдніка. З аднаго боку, ён выхваляе яго за яго буйную, нястрыманую паэтыцкую сілу, з другога, — яўна іронізуе над яго за лішне ўжо пышнымі, да штучнасьці і недарэчнасьці, аздобамі паэтыцкага стылю, якія, можа, і патрэбны, каб заступіць адсутнасьць паважнага зьместу, але толькі засланяюць гэты зьмест, калі ён ёсьць. Усе гэныя пустагучныя прыборы і штукі ён лічыць зусім недарэчнымі ў сваей паэме, якая мае ў сваей аснове *гістарычную праўду вялізарнай важнасьці усенароднага здарэньня,* а сваей мэтай мае — *вывесьці з гэтага здарэньня вялікай важнасьці „урок" палітычнага розуму для ўсяго народу.*

Параўнаньне расказу „Слова" з суадказным апавяданьнем летапісаў (у Іпатаўскім летапісу — пад 6695 г.) сьведчыць аб тым, як точна аўтар трымаўся гэтай так высака цанімай ім, нават у паэзіі, гістарычнай праўды.

Гістарычнае здарэньне, якое лягло ў аснову „Слова," гэта— паход чатырох князёў *якраз з беларускага пляменнага абшару старадаўняй „Русі"* — проці адвечнага ворага славянскай Русі, пагражаўшага яе жыцьцю, волі і незалежнасьці з усходу і з поўдня, проці нязьлічаных турка-татарскіх ордаў, — качаўнікоў, наплываўшых з бязьмежных стэпаў Азіі. Але-ж, з гэтым самым турка-татарскім „усходам," проці якога трэба было аружжам бараніць самае сваё існаваньне, старадаўняя славянская Русь, апроч вайны, мела ўсьцяж, у мірныя часы, сталыя гандлёвыя зносіны. Мала таго, мірныя гэтыя зносіны закрапляліся ўмовамі і асабістымі, сямейнымі сувязямі паміж павадырамі з абодвух бакоў: рускімі князямі — і ханамі гэтых валацугаў стэповага ўсходу. Адбіцьцё абодвух гэтых істотных мамэнтаў жыцьця народаў — *вайну і мір* — маем мы і ў нашай слаўнай паэме, якая, такім чынам, зьяўляецца якбыццам нашай усходня-славянскай „Іліядай" і »Одыссэяй« адначасна.

На чале злучанага войска стаў пачынальнік усяго паходу, ноўгарад-северскі князь Ігар Сьвятаслававіч. Разам з ім пайшлі— брат яго Ўсевалад, кн. Трубчэўскі, іх пляменьнік Сьвятаслаў Олегавіч, кн. Рыльскі, і сын Ігара—Уладзімер, кн. Пуціўльскі Апроч таго, кн. Чарнігаўскі Яраслаў прыслаў атрад свайго войска ў дапамогу Ігару.

Як бачым, блізу ўсе гэныя княжствы ляжалі на тэрыторыі, якая ахопліваецца *этнографічным абшарам Беларусі* нашых часоў.

Вельмі цікаўна, што ў самым „Слове,“ якое мае выразную палітычную ідэолёгію, пабудаваную на галоўнай ідэі *адзінства Русі*, няменш ясна сьцьвярджаецца, хаця-ж, ясна, і асуджаецца — *існаваньне* супярэчных імкненьняў, імкненьняў да самастойнасьці, да нікаторага „сэпаратызму,“ як мы скажам цяпер, да выразнай незалежнасьці ад кіеўскага цэнтру — нават у такіх справах, як вайна і мір, ад якіх залежала бясьпечнасьць усяе тагачаснае Русі. Мала таго,—якраз на гэтай супярэчнасьці, на гэтым сэпаратызьме „малодшых князёў“ вялізарнага, ляжачага на поўнач ад Кіеўшчыны, абшару, з цэнтрам ноўгарад-северскім, пабудавана якраз уся наша вялікая паэма старасьвеччыны. І гэта робіць „Слова“ асабліва цікаўным для нас Беларусаў.

(д. б.)

Песьня аб паходзе Ігара

(„Слово о пълку Игоревѣ“)

Вершаваны пераклад Янкі Купалы)*

ЧАСТКА IX

Ўжо бо Сула не цячэ ручаінай
К Пераяслаўлю быстрай, срабранай;
Дзьвіна ўжо балотам цячэ бязупыну
Да Палаўчан, пад воклік паганаў.

Адзін Ізяслаў толькі — сын Васільковы
Сам пазваніў мячамі сваімі
Аб шлёмаў літоўскіх стальныя аковы,
Ускалыхнуўшы днямі былымі.

Свайму пераняў славу дзеду Ўсяславу,
Сам пад чырвоным шчытам пабіты
Мячамі літоўскімі, лёг на крывавай
З Хоцьцем траве. А кажа тады той:

—„Дружыну тваю апранулі, князь, крыльлем
Птахі, а зьверы кроў палізалі!“
Ня быў тут брат Брачыслаў, над кавыльлем,
А ні другі — Усяволад. У жалі

*) Перадрукоўваем із „Збору твораў“ Янкі Купалы, т. IV. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Менск 1928. [Рэд.).

Адзін ён жамчужную з храбрага цела
Выпусьціў душу праз ажарэльле.
Заныла гамонка, вясёласьць зьнямела,
Трубы ў Гародні смутна запелі.

Яраславе і ўнукі вы ўсе Усяслава!
　　Апусьцеце ўжо сьцягі свае,
Пахавайце мячы пашчарбаны, бо слава
　　Ужо дзедава вас не спаўе!

Вы бо сваркай сваёй напусьцілі
　　Скрозь паганых па Рускай зямлі—
Па надзеле Ўсяслава, з чаго і насільлі
　　Ад зямлі Палавецкай пайшлі.

У сёмы Траянавы век
Уздумаў Ўсяслаў варажыць
Аб мілай дзяўчыне сабе,
Што з славай яго заручыць.

Пусьціўшыся ў хітрыкі, ён
На борздага ўсеўся каня
І скочыў, памчаўся чым-сьвет
Да Кіева—града, да дня.

Кіеўскі дзідаю там
Пасад дакрануў залаты;
Ад іх скочыў зьверам лютым
З Белгорада ў поўнач; тады

Ахутаўся сіняю мглой,
А раньнем, узьняўшысь да зор.
Навограду браму лязом —
Сякераю насьцеж адпёр.

Разьбіў Яраслававу там
Прыдбаную славу мячом
І скочыў праз поле і лог
К Нямізе з Дудутак ваўком.

На Нямізе снапы сьцелюць
　　Галавамі,
А малоцяць-жа стальнымі
　　Іх цапамі.
На таку жыцьцё кладзецца
　　Неспадзейна,
І душу ад цела веюць
　　Безнадзейна.
Берагі ў крыві Нямігі
　　Па калені;

Не дабро на іх пасеяў
      Сейбіт жменяй.
А былі яны гусьценька
      Ў процьмах вузкіх
Там засеяны касьцямі
      Сыноў Рускіх:

Усяслаў князь людзям суд судзіў,
Гарадамі князёў надзяляў,
А сам поначы, сьвету на зьдзіў,
Ваўкалакам ці воўкам гуляў.

Ён бо з Кіева да пятухоў
Горад Тмутаракань дасьцігаў
І вялікаму Хорсу бяз слоў
Воўкам шлях борзда перабягаў.

Таму ў Полацку рана званы
Пазванілі ў Зафеі сьвятой
Да завутрані, — ён-жа праз сны
Ужо ў Кіеве звон чуе той.

Хоць і вешчая, кажуць, душа
Ў дзёрскім целе ягоным была,
Але часта бяды без нажа
Нацярпеўся, што доля дала.

Яму першаму вешчы Баян
І прыпеўку дасьціпна зладжыў:
„Хітры, быстры, ні птах той быстран
Суду Божага не пераджыў!"

О, стагнаці ўжо Рускай зямлі,
Як успомніць князёў з былых пор!
Уладзімера таго не маглі
Прыкаваці да Кіеўскіх гор.

А цяпер яго сьцягі ніштó:
Адны Рурыку славу шумяць,
А другія — Давідавы ўжо...
Але стужкі іх розна вісяць.

ЕРОНІМАС ЦЫЦЭНАС

Аб краіне, якая свабодна жыве

І што я табе, дарагі чытачу, магу сказаць аб Літве і аб Літоўцах?

Вазьмі мапу і кінь вокам на край, што ляжыць між Балтыцкім морам і латвійскай граніцай і дзе плывуць рэкі — Нёман і Вяльля. Гэта край людзей, якіх старадаўная гісторыя балтамі называла.

Вазьмі статыстыку: 56,000 клм². і 2,549,668 насельніцтва.

Адам Міцкевіч, жорсткім лёсам выкінуты на чужыну, тужліва й упорыста паўтараў:

„Litwo, ojczyzno moja!"

„Litwo..." Так, чытачу, ты гэты край ужо здаўна знаеш. Вазьмі гісторыю:мае й твае прашчуры шмат супольнага мелі.Тваей мовай мае князі ў канцэлярыях пісалі, вялі дыплямацыю, тваей мовай напісаны Літоўскі Статут.

Чытачу! У 1915 г. праз твае палі немец прайшоў у Расею; цяжкіх гарматаў калёсы ў пясок абярнулі нівы, засеяныя збожам, на месцы збураных вёсак акопы паўсталі і некальлі гадоў ня хлеб зямля радзіла, а сьлёзы, эпідэмію, здэмаралізаваньне. Ты, выкінуты з бацькаўшчыны, з помстай у сэрцы сьціскаў кулак свой. Ненавідзеў ты немцаў, патомкаў тых, якіх мае й твае прашчуры пад Грунвальдам на доўгія вякі зламалі.

Раманавых сям'я, — малых народаў вораг № 1, — ведамы і табе й мне, і ня ведаю дакладна, але чую, што беларус Кастусь Каліноўскі на захадзе Расейскай імпэрыі падняў сьцяг свабоды для ўсіх паняволеных народаў.

Песьня майго народу ўспамінае, што літовец „не ў фальварку і не ў двары рос, а ў вялікай нядолі". Нешта падобнае і ў цябе мусіць быць. Дзяды нашы разам несьлі цяжар паншчыны, дваром свой мазоль і пот аддавалі. Паны ў школу нас ня пушчалі, у цемнаце трымалі. Урэшце выйшлі мы з дворнай няволі, але, на жаль, былі мы адпушчаны малазямельнікамі і хутка папалі ў няволю новых часаў, у няволю эканамічную.

Тым самым жалем плакала маці беларуска і маці літоўка, калі сына жандар у рэкруты забіраў.

Твайго народу цар не прызнаваў,рознымі спосабамі спыняючы яго нацыянальнае жыцьцё, і мой так сьціснуў, што ад 1864 аж да 1904 г. забараніў яму палітоўску пісаць, чытаць і друкаваць. Літоўская маці тайком вучыла сваё дзіця роднай мовы, хоць грэзілі ёй арышты, ссылка, віселіца, хоць кожны шаг сьлядзіў жандар і сышчык, хоць была, як кажа паэт Майроніс: „ноч бяз раніцы". Гэткім нелегальным спосабам ішоў літоўскі народ да свабоды. Вось што аб гэтым кажа ў 1895 г. аўтар народнага гімну В. Кудірка: „Ці гэтая маскоўская адміністрацыя такая агід-

ная, ці такая глупая, калі не разумее, што ваеннай камандай нельга супакоіць абуджаны дух народу, што самыя адважныя ротмістры, найсьмялейшыя генаралы, у руках якіх адміністрацыя, не ўспакояць патрэбаў духа і што ў барацьбе з прыродным чалавека пачуцьцём раней ці пазьней прайграюць ротмістры".

Літва ня ўпала прад расейскай імпэрыяй на калені. Напроціў, Літва, хоць і слабенькая, без арганізаванага грамадзянства, малазямельная і батрацкая, аб'явіла двугаловаму арлу вайну, вайну аж да апошняга выніку: жыць або памерці!

Сяньня, гледзячы з пэрспэктывы мінулых гадоў, можна з гордасьцяй запытацца: дзе цары, дзе Мураўёвы, дзе „матушка Россія?" Жыцьцё цьвёрдым кулаком скрышыла гэную „турму народаў". Не жандар літоўцу, а літовец жандару ўбіў у гроб апошні гвозд.

Чытачу! Ты знаеш Літву мінуўшых дзён, з якой ты ў многіх выпадках перажыў сумныя гадзіны.

Я маю намер расказаць табе аб Літве новай, аб Літве, што перажыла 20 гадоў свабоды.

1896 г. літоўскія народныя барацьбіты кінулі кліч незалежнасьці Літвы. Розныя дэфэтысты з гэтай прычыны сьмяяліся з іх. Прайшлі 22 гады і ў міжнародную гісторыю ўпісана Літва, як незалежная і самастойная дзяржава.

Згалелы, зьбеджаны, змучаны літовец 1918 г. 16 лютага з за гор убачыў усходзячае сонца. Было гэта абвешчаньне Незалежнасьці Літвы. Літовец гэтае сонца спаткаў і запрасіў яго ў сваю сялянскую хату.

За 1918-20 г. на фронце памёр 1401 літоўскі жаўнер, паза фронтам — 1066, 2671 — раненых і 154 інваліды. Падчас забароны друку толькі ў 1891—1902 г. аднята ад „кніганашэльнікаў" 173 тысячы экзэмпляраў літоўскіх кніг, тысячы асоб папалі ў вастрогі, памерлі ад куль пагранічнікаў, пагінулі ў Сібіры.

Але сяньня прыгожае сонца сьвеціць над Літвой. А гэтага сонца імя — Незалежнасьць.

Сяньня ў Літве 6444 вёскі скамасаваны, сяньня (да 1937 г.) за дзяржаўныя грошы мэліорацыя абняла 379.659 га лугоў і балотаў; сяньня „Pienocentras" утрымлівае звыж 300 малачарняў, у якіх перарабляецца звыж 300 міліонаў літраў малака (селянін за малако атрымлівае да 30 міліёнаў літаў, за вывожаныя за граніцу 15 міліёнаў клг. масла); сяньня „Maistas" вывозіць мяса на 42,720,000 літаў; „Lietukis" да 1938 г. толькі за лён атрымаў ад заграніцы да 500 міліёнаў літаў; 2 фабрыкі цукру ўнутраны рынак абслужваюць цукрам да 30 міліёнаў клг. (сяляне за буракі атрымліваюць 8 міліёнаў літаў); 1247 гандлёвых прадпрыемстваў даюць работу 31.684 работнікам; сяньня 1683 коопэратывы вызвалілі селяніна з капцюроў пасрэднікаў; дзяржава пачала працу, маючы толькі 30.000 ост-марак, а сяньня сума дзяржаўнага буджэту — 340 міліёнаў літаў.

Ці-ж гэта ўсё было-б магчымым без незалежнасьці?

1937-38 г. у Літве (без Клайпэдзкага краю) працуюць 2092 чатырохклясавыя і 295 шасьці-клясавых пачаткавых школаў (усяго разам: 5107 вучыцялёў і 276,675 вучняў); ёсьць намер увесьці прымусовы курс шасьцігодняй школы; сяньня, апрача гэтага ў Літве ёсьць: 1) 28 рамесьленых школ (307 вучыцялёў і 2651 вучань) і 54 школы профэсыянальныя (1200 вучняў); 2) 89 школ сярэдніх (18.838 вучняў), 3) Унівэрсытэт ім. Вітаўта Вялікага (7 факультэтаў, каля 300 навучаючага пэрсоналу, 3064 студэнты); 4) Земляробская акадэмія ў Датнове (200 слухачоў, для навуковых мэтаў 470 га аромай зямлі і 2500 га лесу); 5) Школа Мастацтва, 6) Музычная Консэрваторыя; 7) Гандлёвы Інстытут у Клайпэдзе, 8) Пэдагогічны Інстытут і 9) Вэтэрынарская Акадэмія.

Гэта ўсё Незалежнасьці заслугі!

Незалежнасьць відацца й тут: 1) Унівэрсытэцкая бібліятэка мае больш 100 тысяч тамоў, 2) Земляробская Акадэмія— 22 тысячы тамоў; 3) Дзяржаўны Цэнтральны Архіў — 150 тысяч тамоў, 4) У бібліятэцы пачаткавых школ у 1930 г. зарэгістравана 408,058 тамоў; усяго разам: каля 2000 бібліятэкаў з $1^1/_2$ міліёнамі тамоў.

Толькі ў вольнай краіне праз год вучыцялі могуць наладзіць 56 народных унівэрсытэтаў, у якіх чытаецца 4032 рэфэраты, а іх слухаюць 168.156 слухачоў.

Першая літоўская кніжка выйшла ў 1547 г. Яе разьвіцьцё было гэткае: XVI ст — 24 кнігі, XVII — 46, XVIII — 193, XIX аж да забароны друку — 891 кніга, ад 1865 да 1904 — 3281 кніга, 1904—1914 — 4050 кніг, 1914—1918 — 800 кніг, праз 20 гадоў незалежнасьці да 13 тысяч кніг.

Рост кнігі можна сабе прадставіць, бяручы пад увагу выдавецтва „Spaudos Fondas". Гэта выдавецтва за 1923 г. выдала 2000 экзэмпляраў, 1925 — 36 тысяч экз., 1927 — 74 тыс., 1935 — 185 тыс. экз., 1937 — 300 тыс. экз. Усяго разам — больш двух міліёнаў экзэмпляраў кнігаў. У іх уложана больш як 1,5 міліёнаў літаў. За апошнія 6 гадоў „Spaudos Fondas" прадаў кніг на 3,720 тысяч літаў, толькі ганорару аўтарам выплаціла гэта-ж выдавецтва звыш 500 тысяч літаў.

У мінулым годзе ў кнігарнях усей Літвы праз першыя 7 месяцаў прадана прэм'еваных кніг больш-менш па 2300—3700 экз. у кожнай. А прэміі кожны год вызначае ў граніцах 1000—5000 літаў Міністэрства Асьветы, „Spaudos Fondas", „Sakalas", „Spindulys", „Чырвоны Крыж" і інш.

Першы літоўскі часапіс паказаўся 1832 г. Прад сусьветнай вайной, у Літве, што была пад Расеяй, выходзіла 25 часапісаў. У 1937 г. у Літве выходзіла 157 пэрыёдычных выданьняў (19 штодзеньнікаў, 38 тыднёвікаў, 100 іншых; каля 850 тысяч экз. усяго разам), а аднаго з іх: „Ukininkos Patarejas" расходзіцца па вёсках звыш 80 тысяч экзэмпляраў.

Гэта плады Незалежнасьці!

Незалежнасьці пяюць у Літве песьню 415 арганізаваных хораў (звыш 17 тысяч харыстаў).

Дзякуючы незалежнасьці ў часе 1919—37 г. 38,489 беззямельных атрымалі на ўласнасьць 360,068 га, а 25,924 малазямельных так-жа на ўласнасьць атрымалі 89,628 га; апрача гэтага так-жа атрымалі зямлі: 7,883 бедныя жыхары места, 201 парафіяльны касьцёл, 498 могільнікаў, 57 школ прыватных арганізацыяў, прытулкі і інш. Усяго разам на ўласнасьць атрымалі зямлю 73.052 асобы і арганізацыі, якім дана 455,613 га зямлі.

Чытачу! Гэтак выглядае новая Літва, упісана як дзяржава ў сучаснае жыцьцё сьвету.

Учарашні прыгонны сяньня жыве сваей воляй і свабодна наладжвае сваё жыцьцё. У гэтым жыцьці могуць быць перашкоды, могуць быць скрыўленьні і памылкі, але сама дарога, што вядзе праз свабоду, ёсьць праўдзівай, непахібнай.

Чытачу! Вышэй паданае выясьняць табе і памогуць зразумець — адрывак з працы літоўскага пісьменніка П. Цвіркі і вершы найнавейшых літоўскіх паэтаў. Можа яны ня будуць так дасканальны, як іншых краёў, можа ў іх не спаткаеш думак, як у іншых, але напэўна адчуеш, што гэта пакаленьне тых, якія далёка адкінулі і ярмо паншчыны і палітычнай няволі. Бо-ж гаспадар не прыбірае сваей сьвятліцы, калі сама хата гарыць. Гэтак і з літоўскай паэзіяй. Да здабыцьця незалежнасьці і яшчэ некалькі гадоў незалежнасьці, літаратурнае творства, сусім зразумела, служыла справе бясьпечнасьці народу і агулам штодзенным патрэбам.

Чытачу! Калі табе прыдзецца быць у Коўні і бачыць вялізарны будынак Музэю Культуры ім. Вітаўта Вялікага, паглянь на бярозу, што расьце недалёка і на мінуту замоўкні, супакойся... Ціха гойдаюцца галіны дрэва, паважна стаіць будынак культуры, здалёку даносіцца рытмічны шум і ўгары над табой ціхае і раскошнае літоўскае неба — яны табе дапамогуць зразумець жыцьцё доўгавечнага твайго суседа.

Гэтулькі я табе. Браце Беларусе, магу сказаць аб Краіне, што пражыла 20 гадоў свабоды, сказаць тут, у Вільні, пазіраючы праз вакно ў сьцюдзёны траўнёвы вечар, на крыжы сьвятыняў, што ўзносяцца над местам і на тыя горы, што яго акружаюць...

Пераклаў **Ад. Станкевіч**

АНТАНАС МІШКІНІС

Песьня аб Літве

Сінякрылыя кружаць птушкі;
Да нас вернуцца скора яны.
Па Жамойці, Аўкштоце і Дзуках
Запяюць рэкі, горы, бары.

У задуме там шэрай хаты,
Над гасьцінцам — бярозаў сукі;
Будзе зеленьню пахнуць ральля там,
А Літва зарунее ў душы.

Зааром плугам кожну пядзю.
Бараной скрышым мора ральлю —
Старой долі сьляды загладзім,
Дзесь у прочкі прагонім бяду.

Самалётамі кінем весьці
У чужыя далёка краі.
Як кахаюць, каб зналі ў сьвеце,
Край ярынаў густых Ліцьвіны.

І нашто, скажым, зерні сыпім,
І за гумнамі сьпелім ляны,
Як пагоніць за лес, за сіні,
Вясна рэкамі сьнег і ляды.

Хай грымяць на'т сабе грымоты —
Калі ў сэрцы Літва зацьвіціць,
На вялікую рушым работу,
Каб усім было лепей тут жыць.

Што было — хай загіне бяз сьледу!
А цяпер—у вялікі паход!
Серабраным вазом паедзім —
Прывязём сабе Новы Год.

Вось пад небам ўжо кружаць птушкі,
Гэта новай вясны там арлы!
Па Жамойці, Аўкштоце і Дзуках
Зазьвіняць нашы горы, лясы!

Пераклаў А. Г.

ЯН КОССУ АЛЕКСАДРАВІЧІУС (псеўд. Коссу-Александравічус, Ян

Пэйзаж

Ніва з прыдарожным крыжам,
Ў далі сіні пояс дрэў,
Аблакоў густыя крыгі,
Сумна звонючы напеў.
І бяроз і ветру гоман
Навяваючы тугу,
Мох зялёны на саломе
І вячэрні ціхі гул.
Далей тонучыя сёлы.
Ўклёнах стройных і густых
Нейкі шэлест ліп вясёлы,
Нейкі сум іх залаты.
Толькі скрып асьвераў льецца,
Шолах песьні у траве. —
Добра жыць тут і памерці,
Гараваць тут у Літве.

Пераклаў **Максім Танк**

КАЗІС БОРУТА

Вобраз

Няраз блізкі твой бачу грозны вобраз
і вочы заімглёныя тугой, —
таму я жалюся на лёс нядобры,
на згасшыя сны шэраю парой.

Калі у віхры сэрца замірае, —
я ведаю — сьвет родзіцца другі,
з імглы ўстаюць дні новыя над краем
і бачу я нядолі берагі.

Тады зазьзяе твар агнём усходу
асыпяць зоры сьлед тваіх дарог.
І сонца мне зайшло не назаўсёды —
яно усходзе у тваіх вачох.

Туга і сум зьнікае, разсяецца
кругом як раніцай сьвятло, агні,
ўчарашні боль такім малым здаецца,
і толькі бачыш казачныя дні.

Прылівам сіл, надзеяй ўсхваляваны,
прашкоды крышучы—далей ідзём,
свабоды сонца устае ў змаганьні,
і новае прыгожае жыцьцё.

Пераклаў **М. Танк**

ПЯТРАС ЦВІРКА

Падзел зямлі*)

Павылазіўшы з паграбоў, пастаўленых на месцы спаленых вайной хатаў, зазялянеўшымі межамі, сьцежкамі беглі сяляне на падзел зямлі паглядзець. За дваром Вышыншчына, у бок альшэўніку, на пустых палёх чарнелі грамадкі мужчын і жанок. На беразе рову сядзелі старыя, частаваліся табакай і прыглядаліся да работы каморнікаў. Навокал круціліся хлопцы й дзяўчаты, гаманілі, сьцёбалі адзін другога дубцамі, вербамі. На ўсіх твары відацца была нейкая вясёласьць, усёроўна як-бы на маёўку былі сабраўшыся.

Сьмялейшыя лезьлі да каморніцкіх прыладаў, прасіліся паглядзець, усюды сулілі памагчы. Сярод шчасьліўцаў, даступіўшых паўзірацца праз астралябію, быў так-жа і Таруціс. Калі ён адвярнуўся, ахопленыя цікавасьцяй з грамады пыталі:

— Ці бачыў што?

— А як-жа! — усьміхаючыся казаў Таруціс, — граф сядзіць у балоце і ногці грызе. Ідзіце паглядзіце!

— Ну й жартаўнік гэты Юрка!

Сівы, як пухавінка, дзядок, некалькі гадоў пракрактаўшы ў ложку, апіраючыся на вялікі кій, прыклыпаў паглядзець каморнікаў, бо й да яго вушэй, занесеных пяском, заросшых густой шэрсьцяй, прабілася вестка аб замяшаньні каралеўстваў і аб зямлі падзеле.

Глухі быў дзядок, ня ўцяміў, што Таруціс з такой радасьцяй на твары абступіўшым яго выясьняў. То аднаго, то другога, цягнучы да сябе за рукаво, прасіў дзядок, каб сказалі, хто гэта такі, каторы гавора і што тут сталася? Хлапец шалаплут да вушэй дзеда прылажыў вусны:

— Цара забілі, Мікалая. Вайна будзе швэда з апонцам. Акопы капаем.

Па гэтых славах дзіцячыя нябескія вочы дзядулі зацягнуліся тканінай маршчынаў. Хвіліну, нахінуўшы вуха, надслухаваў, яшчэ здаровымі зубамі моцна прыкусіў дзеравяны цыбук люлькі і пры тым пусьціў з роту камы дыму.

— На што яго дражніш? — накінуліся старэйшыя на верхаласа. — Яго волас табе не таварыш.

— Калі ён усёроўна ня чуе. Парцэляцыю ў вушах трэба рабіць!

Навокал дзядулі і дразьнячага яго хлапца яшчэ больш сабралася. Таруціс нахіліўся да дзеда і доўга крычаў:

— Гэтыя землі забяром. Цяпер, дзядуля, самі будзем упраўляцца. Брухачоў зьвядзём. Усе будзем працаваць, і роўныя ўсе

*) З раману: „Žemė maitintoja" — Зямля карміцелька.

будзем. Дзядулю, як найстарэйшага, нашым судзьдзёй паставім. Ці добра будзе?

— Сьмех будзе бацьку нябожчыку і сыну, каторы йшчэ не нарадзіўся. Эх. вы забабоны! — зьбіраючы крошкі думак, дзядуля зьвярнуў у бок свае заглохшыя вушы. І з пад густых валасістых, інеем пакрытых броваў, столетнія вочы бліснулі на каморнікаў, рэжучых графскую зямлю, і ня ведалі, сон ці сапраўднасьць яны бачаць.

Ня ўсіх закранулі сэрца абяцаньні свабоды і зямлі. Просты чалавек, вякамі ашуківаны, вякамі ў дугу гнуты, прывык пірагом панскім ня верыць. І на парцэляцыю большасьць глядзела, як на воўчую яму, якую ім дворныя паны капалі.

Толькі маладзейшыя, хоць і бяз мінуўшчыны, аднак з балючымі досьледамі свайго веку, сьвятлей на ўсё глядзелі. Рагаталі, сьмяяліся, спрачаліся хлопцы, сабраўшыся тут дзеля важных спраў, з рыдлёўкамі, як старога жыцьця далакопы — усе патомкі роду прыгонных, патомкі бізунамі з дубцоў ёмкіх, розгамі і голадам вынішчанага пакаленьня.

І ў Таруціса грудзі ўліваўся нейкі радасны неспакой, тужлівасьць, — слухаючы гутаркі суседзяў, гледзячы на прабудзіўшыяся, неабнятныя палі, на ярка зялёныя раўніны, па якіх бегалі людзі і заганялі калкі. Першы раз так зразумела адазвалася пад нагамі зямля, якую большасьць будучых сялян ногцямі дзёрла і дасьледжвала, згадвала, ці добрая будзе зярняці, ці лёгка падоляе саха.

Юрка хадзіў ад аднэй грамадкі да другой і, ня могучы інакш выліць радасьці, лаіўся:

— О, рапуха, глядзі, якая доўгая вёска будзе!

На руках насіў ён васьмімесячнага артая, паказваў людзям і казаў, што сын так-жа павінен бачыць падзел зямлі, пахові́ны магутнасьці графоў і паноў і, што ўспамінаючы, як вырасьце, каб мог хваліцца, што быў сьведкам гэткага часу.

Урэшце першая лінія была праведзена, першы капец, аддзяляючы дворнае поле ад зямлі новай вёскі, абкапаны. Памагчы ў гэтай важнай рабоце прыбег, хто толькі меў якое прыладзьдзе, а большасьць магілу графу голымі рукамі насыпала. Капец стаў на стражы сялянскіх нівах. Адзін шалаплут з таўпы, як жывому, махнуў яму сваей зношанай шапкай.

Так мужчыны і жанчыны нага ў нагу, палямі бязіменнай вёскі, за каморнікамі йшлі ў новае жыцьцё. Ніхто ня думаў, хто яго створа, толькі чуў, што Вышыншчына закатлавалася, як паводка веснавая, і хлопат быў-бы цяпер яе спыніць.

Крыху пазьней Таруціс, пазычаючы суседу рыдлёўку, любіў казаць:

— Ня згубі. Ты ня ведаеш, што я хаваю яе ў музэй. Першы капец у Клангісах насыпала.

Хутка насыпалі і іншыя капцы, азначылі лініі, толькі ўжо аддзяляючыя ня дворную зямлю ад новай бацькаўшчыны, але

зямлю Янкі ад Казюка, Тодара ад Юркі. Палі былі парэзаны і так падзелены, што жадаючыя больш атрымалі горшыя нівы, балоцістыя, а ўзяўшыя менш, атрымалі сушэйшыя, вышэйшыя. Юрку, як жаўнеру, бадай першаму было дана права выбіраць. Папаўся нішто палетак, — з лужком, з горкай, з малой, летам высыхаючай, рэчачкай, з уласным паднябесьсем. Апрача яго, як ваеннага, з таго самага падзелу атрымаў адзін старшы ваенны, а астальныя палеткі прыпалі парабком, Юрчыным таварышам— Лінкусу, Гінкусу, Даўбасу, Бяпіршцінісу і некалькім яшчэ незнаёмым, здалёку.

Скончыўшы вызначаньне надзелаў, камісія на месцы пажадала сялянам новага, дастатнага жыцьця. У такую ўрачыстую часіну ня трэба было надта адважным быць, — песьня ці слова мусілі вырвацца з грудзей. Юрка і не пачуў, як, падаўшыся ўперад, прамовіў:

— Паважаныя грамадзяне і паважаная камісія — моцна ўсхваляваўшыся, запінаючыся, не знаходзячы месца для рук, галасьней чым трэба было, пачаў новы гаспадар. — Я хачу сказаць чыстую праўду. Мы людзі, няхай кажуць, што п'яніцы, цёмныя, але ўсёждыкі жывём мы ў гнілых паграбох. Калі мы, гэтыя людзі, ня можам мець навукі, гэта — граматы, дзеля таго мы дурныя, дык усіх перапрашаю! Не, мы ня дурныя і мы ня вінаватыя. Днямі мы працуем і кармім дармаедаў, а начамі сабе стараемся. Гэта ёсьць крыўдным, на маю думку, грамадзяне. Жартаў няма. Цяпер, калі мы адваявалі свабоду і незалежнасьць — інакш зажывём. Гэта зямля — наша. Паважаную камісію просім прыехаць у госьці па чатырох-пяцёх гадох, калі зазялянеюць нашы палі. Можа й ня так смачна пачастуем, як у двары, але пачастуем ад сэрца.

— *Valio!*)* — закрычалі сяляне, навучыўшыся гэтага клічу на вечах.

Юркі мова падабалася ўсім, не гаворачы аб жонцы, каторая ледзь стрымалася, каб не захліпаць. Монікі такая ўжо была прырода — сырая і сырая, не раўнуючы як падзеленая зямля.

Некаторыя з навасельцаў, пераміргнуўшыся між сабой, із сваіх паслалі ў двор дэлегацыю да каморнікаў, каб не адмовілі ўсёждыкі разам, з імі, абліць зямельку. Перш чым сьлязьмі, — трэба гарэлкай.

Пераклаў **Ад. Станкевіч**

---

*) Няхай жыве, гура!

Страшныя дні

Прыйшлі дні панура, іржой усё пераядаюць гаручай,
як сталь гартаваная, думкі, закулі, і сэрца
і раны, як погляд апошні нявольніка паўшы, балючы,
пагрозай зямлі небу сьвецяць.

Зьвініце словы галасамі вятроў і трывожных сырэнаў!
Хай дождждам асыпяцца зоры, зямля загарыцца агнямі,
Над тымі, што зрылі нам хаты, хай буры крывавыя пеняць,
Яны не ўстаяць перад намі!

Жыць, жыць на прасторах зямлі. Пад нагамі дарогі зьнікаюць.
Апошняя птушка і тая пакінула сёл нашых вехі.
І ветры і ночы хаўтурна ў імгле навяваюць
панурыя хмары на стрэхі.

Скрышыце славы гэты мур,
[што падняўся з граніту, трывожыць,
што боль збудаваў адзяляючы сонца з блакітам.
Я-ж гэту зямлю люблю моцна і пець
[ей хацела-б прыгожа,
ціж толькі ў ей жаль пеpажыты...

Пераклаў **М. Танк.**

Не заступіце дарогі...

Не заступіце дарогі вясьне,
калі рэкамі, полем
і гальля гушчарамі
яна йдзе у нашы сялібы...
Бо кожны цьвет і сьвежы пялёстак,
матыль рабакрылы, —
вашы наступы
адаб'е!

Не акаваць вам слоў—у цярпеньнях яны дасьпелі,
ні думкі—яна у грудзёх нашых вырасла...

З дарогі, вы, груганьнё, вы, здані,
што сіняе неба прад намі закрылі!

Вясна ужо ломіцца ў нашы хаты, —
ў душы і на вуснах цярпеньне ня месьціцца...
на шлях шырокі мы выйшлі —
Ня вернемся!
Мы новую долю абвесьцім, створым!

Пераклаў **А. Бярозка**

АЛЬБІНАС ЖУКАУСКАС

Паварот да вершаў

Ня ведаю. Можа ня раз
грашыў я перад музаю маёю.
Але! Ня раз пісаў я вельмі розна.
Я нават лятуцеў, я на‘т любіў парою.

Ды калі кліча край гаротны,
Ці можна лятуцець тады? Любіць ці льга?
—Любоў і мроі—мілы сэрцу пошар...
Мілейша песьня грозная краіне у сьлязах.

О родны край, чаму ты гэткі бедны, сумны?
Хто-ж спусташыў цябе, краіна?!
Надарма, надарма шукаўбы адказу: —
Адно ў сутунку хаткі хіляцца. Скавычуць сабакі
адно ля адрынаў.

Цішыня і ноч. Далёка за зорамі
Ў задуме глухая, цяжкая бясконччына.
Гэтак сумна, калі віхры не сякуць паднябесься...

Укруг цішыня. У цішыні скасьцянелі сёлы.
Хаткі. Гаротныя людзі.— Гэта мая радзіма.

Але гэтак ляцець, каб гнятучую ціш перарваці,
Трэба прастору. Паветра вольнага трэба...Няма яго.
Ні віхраў няма ірвучых...
Таму гэтак сумна зьвіняць мае вершы...

Пераклаў А. Бярозка

Мая зямля

(фрагмэнт з паэмы)

У краі, дзе раніцай крык птушыны зьвініць над вазёрамі,
дзе з тварам зьбялелым дні ападаюць на нівы,
хмары вандроўныя росяць сьлязамі зямлю,
разьбітыя вострай маланкай калышацца ў полі бярозы, —
страшныя зоры мігцелі. І гнуліся з скрыпам
шыбеніцы па дварох, на пляцах гарадоў,
на маю зямлю кідаючы цені панура.
Сібір, далёкі Сібір,
яго лёд зямлю маю глуха скаваў.

Шалелі начамі подыхі ветраў,
ветраў паўночных,

калышучы сіверам хаты, бярозы.
Гады хвалявалі. Вірылі гады, як ускручаны ветрам пясок.
Гора каціласся ўніз, як пушчаны камень на дно.
Глядзелі на ўсё, —
выбітыя шыбы вакон, выцьвіўшыя вочы, дарогі ў краю пазьгінаныя:
на шыях гасьцінцам вязень павіс. Зьвінелі кайданы
і кніг забароненых карткі вецер па краі разносіў.

Ведаю гэту зямлю, убітую ботам немца, расейца, француза,
над каторай ветры шумелі аб горкай крыўдзе народнай,
што вырасла над берагамі Нёмну, Вяльлі.
Па ей пракаціліся буры воен, паўстаньняў, прыгону.
Сумная зямля, панурая і неўраджайная,
дзе з нізкіх балот дымілі хваробы і голад.
Зямля з людзьмі, якіх мылі асеньнія слоты і сьлёзы.
Можа стыдзішся, можа баішся ўсяго, што ідзе і мінула?
Пройдзе. Забудзіш. А ўрэшце — ня наш гэта стыд.
Перабаліць яго неба і сьвет запылае
зьвяўшы з вясной лісьцем каштанаў, сьлязамі, касьцьмі, курганамі.
Застанецца Нёман шырокі і быстры. І на яго берагох
чалавек, як Нёман магучы.
Помніш?
Калі раніцы гасьлі ад крыві пралітай,
гнуліся лозы надрэчныя і кулі вецьце зрывалі,
чуліся можа тады мы шчасьлівымі?

Такая ёсьць зямля. Такая мая зямля,
зрошаная сьлязамі, кроўю і потам,
крыўдай людзкой, няволяй, прыгонам,
пакрыта дарогамі, што вечна ідуць пад гару.
Гэтыя сьлёзы і песьні нізінных імшараў
долю прыпомняць табе чалавека нязнанага
і ўбачыш ты новых людзей і падзеі.

Пераклаў **М. Танк**

ЯН КОССУ АЛЕКСАДРАВІЧІУС

Раніца

Высылаеш вочы на пляц, на шырокі,
Дзе сіні, ўсхвалёваны купал сьвеціць.
Там нейчая моладасьць ідзе адзінока,
Усьмешка нейчая—ведаеш: ня ты гэта.

І хтось нясе цяжар зямлі ўзгаранай...
Цябе тут таксі шум захоплівае сьмелы,
З радасьцю сябе пазнаеш ў спатканых
Ідучы той самай вуліцай век цэлы.

Пераклаў **М. Танк**

ЁЗАС КЕКШТАС

Такое жыцьцё

„О страшная, страшная молададасьць! Пустое сэрца!"
ОСКАР МІЛОШ

Прыходзіла, ды зноў варочалася з ветрамі.
Бы ў казцы.
Ды ў казцы такой не маей!
Ня ў сонечнай,
ня сланай рожамі (такой ніколі я ня чуў).
Драты калючыя мне сэрца грызьлі.
Такое жыцьцё

О, гады, гады, замучаныя!
Вясна з прабітым сэрцам!

Ішоў, як валакіта,—
цёмна, сыра у душы было;
сабе нічога не хацеў: сарванага віхурай цьвету
з дарогі не падняў
і смагу напаіць у лужу ня зыходзіў.

Сьмяяліся яны і пальцам тыркалі.

Думалі,
зьгінаючы што сьпіны,
лесьвіцы сабе да сонца ставяць,
сьлізкую што мінаючы дарогу —
з набітым туга брухам —
сабе прыгожы
дом збудуюць —
і ўжо — паны — ўжо іхны сьвет! —
Жабрацтва.

Мне слалася дарога розна.
Няраз я падаў, падымаўся зноў.
Рукамі кошкаў скрэпшымі
пяшчаны дол,
каб тут-жа, тут-жа шчасьце адшукаць!
І не сабе — другім.
Выла кругом ваўкаўё, —
шалелі буры.

Бяздоньняў многа на зямлі.
На лёд
ня ступіць хто —
не пасьлізьнецца.
І карку ён ня скруціць.

І будуць шанаваць цяпер такога (цяпер
толькі, і як ён—толькі такія).
Тых, каторых шлях вядзе
там — дзе буры,
там — дзе ветры,—
бязкрыжыя магілы ледзь
прыждуць.

Мяне чакаюць.
І добра, што чакаюць.
Хаця бяздольны сам, гаротнік, абарваны,
сарваць я сонца сьнежнымі іду палямі,
каму я дам — на твары тых, —
каб радасьці пабачыць сьмех.

Дваццаць і адзін раз прыходзіла і варочалася вясна
[із ветрамі.
Дваццаць і адзін раз уставала сонца мне і ў кры-
[ві ізноў тапілася.
Бы ў казцы.

Ды ў казцы такой не маей!
Ня ў сонечнай, ня сланай рожамі
(такой ніколі я ня чуў).
Драты калючыя мне сэрца грызьлі.
Такое жыцьцё.

Пераклаў А. Г.

Ноччу

У хмарах пахмурных
крумкач
зьвіў гняздо.

Дарма гушчары
месяц пора
рагаты.

Зоры пагасьлі.
Зямля ў цемры клятай.

Вачэй ўжо ня маніць
блакітны прастор.

Зрок ледзяны
б'ецца
ды б'ецца
аб бераг.
А вецер віхурыць.

Скруціў ды адкінуў.
Вада.
Дрожжу праймае.
Няма тут прыпынку.
Зрок пнецца — пнецца —
і падае
зломлены,
шэры.

Сумна павісла вярба над вадою.

Пройдзе зіма,
пройдзе і ноч,
ня сумуй-жа вярбіна.
І твае апусьцелыя сяньнягаліны
апрануцца ў зелень
вясною.

Пераклаў **С. Х.**

*
* *

Надрукаваны вышэй літоўскі матарыял — інфармацыйны артыкул пяра маладога віленскага літаратара і публіцыстага Еронімаса Цыцэнаса і пераклады некаторых твораў з мастацкай літаратуры на беларускую мову — гэта пачатак нашага бліжэйшага абзнаямленьня з культурай і агулам з духовым творствам братняга нам Літоўскага Народу. Будзем гэтак рабіць і далей у меру нашай магчымасьці. Будзем у далейшым гэтак рабіць і ў адносінах да іншых народаў — Украінскага, Польскага, Латыскага і іншых, бліжэйшых і далейшых нашых суседзяў. З сваей стараны будзем іх — гэтыя народы — інфармаваць аб творчых дасягненьнях — аб культуры, літаратуры, мастацтве, навуцы — нашага Беларускага Народу. Ня трэба даказываць, якая з гэтага ўзаемная карысьць.

Падаём тут кароткія інфармацыі з біографіі, літаратурнай дзейнасьці і яе характару — літоўскіх літаратараў, прадстаўнікоў мастацкага слова маладога пакаленьня, якіх некаторыя творы, у перакладзе, трэба сказаць вельмі ўдачным, на беларускую мову зьмешчаныя вышэй.

З ковенскіх літаратараў:

Ян Коссу Александравічіус — радзіўся ў 1904 г., паэт і крытык. Выдаў чатыры зборнікі вершаў і адзін зборнік крытыкі. Лірык. Творчасьць яго з гледзішча мовы адзначаецца высокай культурай. У 1937 г. атрымаў за сваю літаратурную творчасьць дзяржаўную нагароду. Цяпер студыюе на унівэрсытэце ў Францыі.

Антанас Мішкініс — паэт, лірык. Выдаў два зборнікі. Творчасьць яго глыбока патрыётычная з нікаторым налётам містыцызму; выражае ў тонах бадзёрых, запальных нязломную веру ў творчыя сілы свайго народу і ў яго добрую будучыню. Сын селяніна. У аўтобіографіі сваей зьмешчанай у „Antrieji

vainikai" — Naujosios poezijos antologija, spaudai paruoše K. Binkis, Kaunas, 1936 m. — піша, што ягонай першай літаратурнай школай — а гэта адносіцца роўна-ж і да нашых беларускіх літаратараў — была народная песьня, якую сьпявалі сяляне працуючы талакой падчас ачысткі ільну ў гаспадарцы свайго бацькі. Гэтак было перад вайной. А пасьля? Абвешчаньне незалежнасьці Літвы і барацьба за яе ўтрыманьне. Гэта ўсё пхала паэта да творчай працы. Піша ён (там-жа) аб жыцьці ў незалежнай Літве і аб сваім становішчы: „Расло жыцьцё, рос я, расла Літва. Сам бачыў, як Літва ў маіх вачах зьмянялася. І паўстала ў маім розуме Літва сынтэтычная: ціха-вясковая, вольная, вялікіх інтэлектуальных і іншых здабыткаў, імкнучаяся з вялікім імпэтам увысь"...

„Гэта яна, Літва, ніхто другі, сумам пранікнула мае вершы. Але ад дзядоў і прадзедаў успадкаваў любоў да сваей зямлі, веру ў Літву, працоўную і творчую, не сьвятакрадча крычачую (для „gardaus valgio šaukšto"— для лыжкі смачнай стравы, як сказаў адзін лекар — Вінцук Кудзірка, тварэц літоўскага позытывізму, аўтар нацыянальнага літоўскага гімну, выдавец „Varpas" (1889)—Я.Ш.)—гэта ўсё ня мне аднаму дае сіл да жыцьця і шуканьня Літвы ў самай шэрасьці штодзеннага жыцьця"... Паэт пражывае ў Каўнасе.

Пятрас Цвірка — прозаік, паэт, крытык. Выдаў зборнік вершаў. Як бэлетрыст, з маладога пакаленьня, у літоўскай апініі лічыцца першым, бесконкурэнцыйным. Піша ў прозаічным жанры — новэлі, аповесьці, раманы. Цікава, што пісьменьнік, пражываючы ў Каўнасе, на падставе прэсавых і іншага друку інфармацыяў напісаў аповесьць „Франк Крук", у якой з надзвычайнай праўдзівасьцю і рэалізмам прадставіў жыцьцё літоўцаў у Амэрыцы. Выдаў у прозе: „Зямля карміцелька" (раман), „Майстар і яго сыны" (раман) і „Сярэбраныя баранкі" (новэля). Творчасьць прасякнута грамадзкімі матывамі. Дзеля свайго сатырычнага тону, уважаюць пісьменьніка за літоўскага Гогаля. У аснову творчасьці пісьменьнік кладзе літоўскі народны фольклёр. Творчасьць Цвіркі адзначаецца культурай мовы. Пісьменьнік пражывае ў Каўнасе.

Казіс Борута — перадавы, вельмі здольны паэт, прозаік, крытык. Радзіўся ў 1905 г. Выдаў чатыры зборнікі паэзіі і два зборнікі навэль. У творчасьці выражаны моцна матывы грамадзкага радыкалізму. Пражывае ў Каўнасе.

З віленскіх літаратараў:

Она Міцюте — уталентаваная паэтка, пісьменьніца-бэлетрыстка і драматург. Пражывае ў Вільні і тут студыюе на унівэрсытэце (канчае гуманістычны факультэт). Выдала асобны зборнік паэзіі-лірыкі п. н. „Сьвятло ў дрыгве".

Альбінас Жукаўскас — перадавы, уталентаваны паэт — лірык і эпік. У паэтыцкай эпіцы, паводле літоўскай апініі, ня мае сабе роўных сярод літаратараў маладога пакаленьня нават і ў Каўнасе. Піша і прозай, а так-жа займаецца публіцыстыкай. Студыюе цяпер у Варшаве ў школе журналістаў.

Ёзас Кекштас — здольны паэт лірык і перакладчык. Творчасьць яго выражае мамэнты грамадзкага радыкалізму. Мае прыгатаваны да выданьня зборнік лірыкі „Такое жыцьцё".

Еронімас Цыцэнас — здольны публіцыст і культурна-грамадзкі дзеяч. Зьбіральнік літоўскага фольклёру. Выдаў у 1934 г. асобнай кніжыцай „Вераваньні з даўгеліскай воласьці" (Daugeliškiniai Burtai). Выдаў так-жа папулярна-навуковы гістарычны нарыс аб паўстаньні і скасаваньні паншчыны ў Літве п. н. „Дні пражортыя дварамі" (Dvaruos praestos dienos).

Я. Ш.

ШОТА РУСТАВЕЛІ

Віцязь у тыгравай скуры

Уступ

(адрыўкі)

Ты магутнасьцю бязьмернай сьвету даўшы існаваньне,
Ажывіўшы ўсё жывое, на планэце няжывой,
Перадаў Ты людзям землю, ўсю у сонечным убраньні,
Даў прастолы венцаносцам — роўным воблікам з Табой.

Бог адзіны! Творца дзіўны, на зямлі ўсяго жывога,
Заступіся, дай мне сілу, каб я д'ябла перамог.
Захавай да самай сьмерці пал каханьня агнявога,
Адпусьціўшы грэх вялікі, што на сэрца цяжка лёг.

Я Тамар услаўлю воблік — уладарны, ясназоры,
І каму з высокіх словаў я сплятаў ужо вянок.
Мне пяро-трысьнік паілі чорных воч яе вазёры —
Хай-жа сэрца працінае песьня вострая — клінок.

Цяжка мне царыцу славіць словам песьні нявымоўнай,
Вейкі апяваць і бровы, палкіх воч яе агонь.
Зубы, што падобны пэрлам, вусны — як рубін цудоўны,
Але дробіць камень молат — з волава хай будзе ён.

Мне патрэбны: сіла слова, сэрца палкае паэта,
І прадбачнасьць, каб паэма загучала, як закон;
Узьвялічым Тарыэля, узьнясём яго над сьветам,
Тром героям вечнай дружбы — будзе спадарожнік ён.

Я, Рустveлі, пра царыцу я пяю натхненьня поўны, —
Уладарку слаўнай раці — клічу ў прадсьмяротным сьне —
Я зьнямогся, для ўкаханых дзе знайсьці бальзам чароўны?
Дай-жа мне збавеньне цуда, ці ў зямлі спачынак мне.

Для грузін даўно вядомы сказ далёкага Ірана —
Жэмчуг поўдня, што ільсьніўся на далонях тысяч рук.
Я сабраў і скарб народны аб'яднаў у верш чэканы,
Каб царыцына увага мне зьмягчыла цяжар мук.

Дар напеваў — гэта мова мудрай шчырасьці высокай,
Голас слаўны і магутны песьняра ў таёмны час.
Чуламу прыемны вуху рытм пявучага патока,
Думкі шыр ў кароткім вершы — і ўсхвалюе песьня нас.

Выпрабоўваньне для коней — бег на доўгіх перагонах,
Іграку дае пяршынства па мячы удалы ўдар.
Тыж павінен, слова майстар, строфы асадзіць як коней,
Калі ледзь клыпае песьня, верша цягнучы цяжар.

Прыглядзіся да паэта, што сьпявае без натхненьня
І губляе красамоўнасьць і кульгае рыфмаў звон.
Хай ён змоўкне, альбо спрытна завяршыўшы песьняпеньне,
Нібы мяч вядзе чаганам, спраўна к мэце прыдзе ён.

Не паэт, хто дзесьці, неяк верш другі выпадкам скажа,
І уявіць, што славуты — выкліча прызнаньня гул.
Неяк ён радок з радкамі нявыразнай рыфмай зьвяжа
І раве: „Я самы здольны" — ён уparты быццам мул.

Ёсьць другі разрад паэтаў — песьняпеўцаў няумелых,
Словы іх людзкое сэрца ці крануць яшчэ? — Наўрад!
Я-б сказаў: няўдалы лучнік лесам крадзецца нясьмела,
Зьвера ўзяць яшчэ баіцца і пужлівай дзічы рад.

Верш у трэйціх для забаваў, ці прысьвечаных дзяўчатам,
Ці сябрам у час гулянак, для жартоўных іншых мэт.
І такі прыемна слухаць, калі думкі ў ім багата —
Ў мудрым сказе і магутным бачны творца і паэт.

Хто пазнаў жыцьця пакуты, той валодае натхненьнем!
Сэрца хай аддасьць Адзінай, хай прысьвеціць для яе, —
Незраўнанай ў цэлым сьвеце, верша палкае зіхценьне,
І на струнах сэрца песьні пра адну яе пяе.

Сёньнячы я слаўлю тую, чыё імя ў вечнай сфэры,
І пясьнярскі свой учынак ня прынізіў я нічым.
Ўсё жыцьцё маё ў палоне той разьюшанай пантэры,
Вось каго навекі ўславіць вершам думаю сваім.

Я пяю каханьне — з песьняй духаў чыстых ўзьлёт крыляе,
І нявыказаны ў словах іхняй музыкі раскат.
Лёс паэта — лёс шчасьлівы, к сьветлым высям узьнімае,
Але шмат прарочыць гора і суровай крыўды шмат...

Пераклаў **Мікола Хведаровіч**

Малітва Аўтандзіла і патаемны ад'езд

(адрывак з XXIII песьні)

Як зьбіраўся вандраваць ён, то аплакваў сваю долю.
Полаг ночы аравійскай дол і горы атуліў.
Тыя, хто бяду спазналі, няхай неба шчыра моляць.
Аб удачных днях ў мячэці Бога Аўтандзіл маліў.

Ён прасіў: „О, творца неба, вод і земляў неабсяжных,
То дабра, то зла падаўца, як нясталы гаспадар!...
Памажы суняць жаданьні, невядомы, недасяжны,
Над ўладарнымі ўладарны, таямніц людзкіх ключар!

Пад Тваім загадам, Божа, усе нетры, усе высі!
Паліш Ты каханьнем сэрцы, напісаўшы свой закон.
Сьвет прымусіў, каб з дзяўчынай я навекі разлучыўся —
Дык няўжо каханьне з сэрца злосна выкінеш Ты вон?

Божа, Божа, чаша шчасьця! Ты апора мне зямная —
Калі мне, рабу паможаш, буду цэлым і жывым.
Ухілі ад помсты, штормаў, ухілі ад лютай зграі,
Захавай мяне, да неба я ўзьніму ахвярны дым".

Памаліўся і прышпорыў ён свайго каня. Пры браме
Разьвітаўся з шэрмадзінам, каб пакінуць, занядбаць.
Шчокі драў слуга нагцямі, кроў агнём паліла камень,
Як няма патрона дома — хто парадуе раба?

Ён прасіў: „Жыцьця сьвяціла! Засмуціўся дом Твой ценем,—
Пры адходзе ўсходу сонца ты тугу і змрок прынёс.
Я для стрэл, што сэрца раняць, стану вернаю мішэньню,
Замест радасьці і шчасьця буду ліць крыніцы сьлёз!"

Пераклаў **Алесь Гурло**

Я. ШУТОВІЧ

Вялікі грузінскі паэт і яго паэма

(Да 750 гадаўшчыны нарадзін паэта)

Сонечная Грузія — старасьвецкая Кольхіда, ведамая з казкі пра Язона і залатое руно, — краіна, — распаложаная над Ріонам і Кураю, з таго боку Каўказу, — выдала на пераломе XII і XIII стагодзьдзяў свайго геніяльнага паэта, Шота Руставелі, якога значэньне далёка пераходзіць тэрыторыяльныя межы Гру-

зіі. Праславіўся ён на ўвесь сьвет сваей эпічнай паэмай *„Вепхіс Ткаопсані,“* пабеларуску „Візяць у тыгравай скуры,“ так, як праславіўся наш беларускі баян—аўтар „Слова аб палку Ігаравым,“ так як праславіўся Дантэ Алігіеры сваею „Боскаю камэдыяй.“

У мінулым годзе прыпадалі 750 угодкі ад дня нарадзін паэта. З гэтай прычыны ладзіліся юбілейныя ўрачыстасьці так у Грузіі, як і ў іншых краінах. Асабліва ўрачыста адзначаны гэтыя ўгодкі у СССР, у склад якога сяньня ўваходзіць і Савецкая Грузія.

Ні помнікі мастацкай літаратуры, ні гістарычныя хронікі да XVI стагодзьдзя не захавалі ніякіх вестак пра асобу Руставелі. Адзінай праўдзівай крыніцай таго, што мы пра яго ведаем, зьяўляецца ягоная паэма.

Напісана паэма ў канцы XII і пачатку XIII стагодзьдзя (прыблізна паміж 1196—1207 гадамі), — у пару цараваньня слаўнай грузінскай царыцы Тамары (1184—1212), калі мастацтва, літаратура і агулам культура Грузіі дайшла да найбольшага расьцьвету (залаты век). Гэтай-жа царыцы і прысьвяціў паэт сваю геніяльную паэму.

Абазнаёмімся коратка бліжэй з ёю: Твор гэты выражае сілу і глыбіню пачуцьцяў, шырыню сьветапогляду і вялікую культуру аўтара, адзначаецца тонкай сюжэтнасьцю і бліскучай формай цудоўнага верша. Твор глыбока нацыянальны па сваім зьмесьце, па мове, па сваей накіраванасьці, а дзякуючы дасканальнасьці формы, філясофскай глыбіні зьместу, высокай ідэйнасьці, сіле і выразнасьці вобразаў і чалавечых пачуцьцяў, выходзіць паза межы нацыянальных рамак і набывае сусьветнае значэньне.

Паэма — адзін з найвялікшых твораў, якія дала літаратура ў сярэднія вякі.

Для Грузіі яна мае асаблівае значэньне. Яна фармавала нацыянальную душу грузінскага народу даўней, такаяж яе роля і цяпер, падымала гэты народ увысь, да сонца, да зор, да вышыняў культуры і мастацтва. Такое яе значэньне. Аб значэньні і папулярнасьці ў грузінскім народзе паэмы сьведчыць хоцьбы тое, што яна ў некаторай меры сталася фальклёрам. Афарызмы паэмы пераходзяць з вуснаў у вусны грузінаў, шмат трапных выказваньняў сталіся прыказкамі. Асаблівааж аб папулярнасьці паэмы і ейным значэньні ў жыцьці нацыянальным Грузіі сьведчыць такі прыгожы, практыкаваны да сяньня звычай: —грузінка выходзячы замуж, прыносіць свайму улюбленаму партнэру, як вяно, у аздобнай аправе, уласнаручна перапісаную паэму свайго вялікага паэта.

Зьместам паэмы зьяўляецца апавяданьне аб маладым амірбару палкім у каханьні, як сам паэт, рыцару у тыгравай скуры Тарыэлю і яго двух пабратымцах — Аўтандзіле і Фіодоне. Кожны з іх мае свой прадмет любові — царыцу, і ўсе разам, перамагаючы перашкоды, асягаюць шчасьце.

Асноўнай ідэяй паэмы — вялікая праўда, што чалавек знаходзіць шчасьце толькі ў паступовай барацьбе, зьберагаючы вернасьць і сталасьць.

Паэт славіць рыцарскасьць, шляхотнасьць, прапаведуе волю індывідуальнасьці, роўнасьць жанчыны з мужчынаю. Праз гэта стаўся Руставелі прадвесьнікам гуманізму, што ахапіў пасьля ўсю Эўропу.

У паэме выражана пятно свайго часу. Паэма іскрыцца ад мамэнтаў, узятых з нацыянальнага жыцьця Грузіі з канца XII стагодзьдзя. Перад намі цэлая галярэя пэрсонажаў грузінскага сьвету таго часу.

Разглядаючы паэму з гледзішча фармальнага, сказаць трэба аб ёй наступнае: паэма дзеліцца на 58 разьдзелаў – песьняў, напісаных катрэнамі—чатырохрадковымі, аб'еднанымі адным рымам, строфамі. Руставелі, такім чынам, стварыў уласны вершаваны разьмер („шаіры"), з адным рымам для кожных чатырох радкоў, які ў далейшым — на працягу вякоў — панаваў у грузінскай паэзіі.

Руставелі — тварэц літаратурнай мовы для свайго народу. Ён, узяўшы за аснову жывую, народную вобразную мову, спрасьціў сучасную яму літаратурную так, як гэта зрабіў Дантэ з італіянскай мовай, Фірдоусі з іранскай, Пушкін з рускай, Катлярэўскі з украінскай, Багушэвіч, Купала і інш. з беларускай мовай. Паэма Руставелева характарызуецца багацьцем лексікі і разнастайнасьці граматычных форм. Уся яна складаецца, прыблізна, з 45.000 слоў, з якіх больш 15.000 зьяўляюцца асноўнымі ў марфолёгічных адносінах.

Дзеля сваіх агульначалавечых культурных вартасьцяў, зацікавіўся Руставелевай паэмай увесь культурны сьвет. Першы пераклад паэмы ў Эўропе паявіўся ў нямецкай мове у 1880 г., у 1885 — у францускай мове, у 1889 г. — у ангелійскай, пазьней у рускай (Бальмонт), польскай, армянскай. У 1937 г. перакладзена паэма цалком на украінскую мову (Бажан). На беларускую мову ў 1937 г. беларускія савецкія пісьменьнікі — Гурло, Броўка, Хведаровіч, Александровіч, Агняцьвет, Жаўрук, Зарыцкі, Ушакоў — пераложылі паасобныя разьдзелы паэмы. Усяго пераложана ў 1937 г. толькі 25 разьдзелаў. Перакладная праца бел. сав. пісьменьнікаў над паэмай трывае і ў бягучым годзе.

Мы побач друкуем некаторыя фрагмэнты паэмы ў перакладзе на беларускую мову, а так-жа верш нашага народнага паэта Янкі Купалы, прысьвечаны слаўнаму юбіляру, у якім Купала ў мастацкай форме перадае ролю і значэньне Руставелі так для Грузіі, як і ўсяго чалавецтва.

ЯНКА КУПАЛА

Сонечнаму Шота Руставелі*)

Грузінка і сонца, і сьнежныя горы,
Віно вінаграднае, месяц і зоры,
Шчасьлівыя сонечна саклі, аулы...
О, колькі прастору для думкі для чулай.

У скалы мёд зносяць руплівыя пчолы,
Чабан грае песьню на зурне вясёлай,
О, слаўная Грузія, Эльбрус героя́ў,
Як соладка жыці, сьпяваці з табою!

Тут казка і праўда жыве з Руставелім
У кожнае скале, у кожным ушчэльлі,
Арол недасяжны, мядзьведзь неапеты
І барс быстраногі нам сьведчаць аб гэтым.

Народ гераічны скрозь горы, даліны
Стагодзьдзямі з сэрцам радзімай краіны
Да нашага часу...
Данёс руставелевы думы і справы.

Стагодзьдзі мінулі, йсьці будуць стагодзьдзі,
А ў гордым... грузінскім народзе,
Для песень, для шчасьця, хвалюючы грудзі,
Як быў Руставелі, так вечна жыць будзе.

Каўказкія казкі, як ласка дзявоча,
Далёка, прывабна скрозь сонца, скрозь ночы,
Разносяць па сьвеце ў людзкія прысельлі
І думы і казкі, што даў Руставелі.

Грузінка і сонца, і сьнежныя горы,
Віно вінаграднае, месяц і зоры,
Шчасьлівыя сонечна саклі, аулы...
О, колькі прастору для думкі для чулай.

Кіславодск
17.XII.1937.

---

*) Перадрукоўваем з „Літаратуры і Мастацтва," № 69, 24.XII.37 г. (Рэд.)

І. М—а

Янка Купала ў крывым люстры

У ўкраінскім журнале „Вістник“ за красавік 1938 г. зьмешчана стацьця В. Піліпчука п. н. „Ідэолёг новае Беларусі?“, прысьвечаная нашаму нацыянальнаму паэту Янцы Купале. Стацьця гэтая гэтак скажае аблічча і ідэалёгію Купалы, што паэт наш выглядае ў ёй запраўды, як у крывым люстры, і дзеля гэтага немагчыма прайсьці міма яе моўчкі, хоць з увагі на яе нізкі ровень аб ёй можна было-б і не гаварыць. Аб грубай тэндэнцыйнасьці аўтара стацьці дае паняцьце нябывалая, здаецца, дагэтуль у вуснах украінца заява, што *„гаварыць сягодня аб беларускай нацыі — што найменш зарана!“* Дык няхай украінцы — навучае ён сваіх землякоў — ня робяць палітычнае абмылкі: няхай пакінуць спагадаць беларусам, а лепш імкнуцца — як само сабой вынікае з ягоных слоў — праглынуць беларускі народ...

Калі чалавек выступае публічна з падобным заклікам, супярэчным з паглядамі ўсяго ўкраінскага грамадзянства, дык мусіць-жа неяк абаснаваць сваё выступленьне, давясьці правільнасьць яго. І Піліпчук прабуе гэта зрабіць, а як — гэта ўраз пабачым.

Піліпчук выходзіць з таго гледзішча, што вялікія нацыянальныя паэты ў сваіх творах выяўляюць душу і ідэалы сваіх народаў. У беларусаў такім паэтам ёсьць Янка Купала. Значыць, ідэолёгія Купалы, выяўленая ў ягонай паэзіі, ёсьць ідэолёгіяй беларускага народу.

Да гэтага месца ўсё як быццам у парадку. Але-ж, пераходзячы да аналізы Купалавае паэзіі, Піліпчук папросту *фальшуе* ягоную паэзію, вырывае з паасобных вершаў радкі, каторыя самі па сабе ня маюць сэнсу і не выяўляюць думкі песьняровае, і ўкладае ў Купалаву творчасьць такія „ідэалы“, якіх ніколі ня меў дый ня мае ані Купала, ані беларускі народ. І вось, паказаўшы гэтак украінскаму грамадзянству ў сваім крывым люстры *сфальшаванага* Купалу, Піліпчук робіць вывад, што беларускі народ мае „бабскую“ псыхолёгію і „зрабіўся малым духам“, зрабіўся няздольным да жыцьця і да барацьбы за сваю волю й нацыянальны быт, за сваё нацыянальнае „я“.

Вось галоўныя думкі Піліпчука, выказаныя ім аб Купале і ягонай ідэолёгіі.

Перадусім Купала прадстаўляецца Піліпчуку далёкім ад народу інтэлігентам, каторы вырас ня з роднае беларускае глебы, а „нахапаў“ жаласьлівых абразоў у чужацкіх паэтаў — расейскіх ды польскіх — і творыць „штучныя абразы“ нібы-то беларускага жыцьця, далёкія ад рэальнасьці, дыктаваныя „фантазіяй“. Як прыклад гэткага нібы-то няпраўдзівага маляваньня абразоў беларускага жыцьця Піліпчук дае *два радкі* з вершу Купалавага „Разьвейся туман!“, каторы заканчываецца гэтак:

Нядоля і гора, навокал — магілы,
Вось роднага шчасьця абраз!...

У гэтым першым тэзісе Пілімчука выялілася перадусім ягоная грубая *ігноранцыя.* Пілімчук ня ведае, што Купала — сын мужыцкае вёскі і апісвае нязвычайна рэальна іменна тое, што запраўды бачыў навакол сябе і перажываў ад малых гадоў; ня ведае і таго, што іменна так, як малюе Купала, запраўды выглядала жыцьцё беларускага селяніна ў тую пару, калі Купала пісаў цытаваны верш — задоўга да выбуху сусьветнае вайны; ня ведае ўрэшце, што апісыванае Купалам жыцьцё роднае краіны глыбака розьнілася ў роўнай меры ад жыцьця расейскага, як і ад польскага. Але — паміма няведаньня — ёсьць у Пілімчука бязспрэчна і элемэнт сьведамага фальшаваньня думак і ідэалаў Купалавых, як гэта пабачым із далейшага.

Зрабіўшы сэнсацыйнае „адкрыцьцё", што абразы беларускага жыцьця ў Купалы — гэта „штучнасьць" і „фантазія", Пілімчук робіць з гэтага і ўсе лёгічныя вывады — роўна ілжывыя, як і самае „адкрыцьце". І калі бачыць (бо-ж гэтага нельга ня бачыць!) у нашага паэта матывы народныя, якімі арганічна прасякла ўся творчасьць Купалы, дык гэта „дысанансам рэжа" ягонае „чулае" вуха. Галоўны-ж „праступак" Купалы — тое, што ягоны мужык шануе сваю мазалістую руку! Гэтае рукі з мазалямі ў беларуса Пілімчук чамусьці дараваць Купале ня можа!

Ідучы ўсё тым-жа фальшывым шляхам і бачучы ў асобе Купалы ня сына мужыцкае вёскі, каторы дае нам непадробленыя абразы яе жыцьця, а чалавека, каторы нібы-то падыходзе да вёскі звонку, Пілімчук і з Купалавых апісаньняў прыроды зрабіў такія-ж „мудрыя" вывады, як з апісаньняў беларускага сялянскага жыцьця. Верна апісаны Купалам факт, што беларускі селянін ад сівое даўніны пераняў страх перад тайніцамі прыроды, для яго незразумелымі, Пілімчук называе страхам *самога Купалы,* а сьцьверджаньне немагчымасьці разгаданьня гэтых тайніц для чалавечага розуму лічыць довадам, што быццам то Купала займаецца прапагандай... „буддыйскага фаталізму"!

Далей Пілімчук пераходзе да ідэалаў Купалы, выказаных у ягоных вершах. Зварот Купалы да Аратага, *каб не паддаваўся злыдням і любіў „сваю ніву, свой край" ды працай сваей „выраў сабе долю",* Пілімчук разглядае, як довад беднасьці Купалавых ідэалаў, як жаданьне Купалы... „ператварыць беларуса ў машыну"! Але-ж бойся ты Бога, чалавеча: ніякая „машына" ня можа нікога любіць, а любоў да Бацькаўшчыны — гэта-ж першы і галоўны канон усяе паэзіі Купалы! — *Пратэсты* Купалы супроць катаржных варункаў працы мужыка, выразнае *асуджэньне* сьлязьлівасьці ды пустога лямантаваньня — замест барацьбы з нягодным лёсам — Пілімчук ізноў-жа перакручавае гэткім чынам, што быццам гэта сам Купала „заліваецца сьлязою з ахвотай". — Сатырычныя вершыкі Купалы на цёмных, нясьведамых сялян, імкненьні каторых не падымаюцца вышэй здаваленьня самых эле-

мэнтарных жыцьцёвых патрэбаў,ператвараюцца ў Піліпчука ў цэлую сацыяльную „праграму“ нашага паэта! — Але найярчэй выяўляецца фальсыфікацыя Купалавых ідэалаў, калі чытаем інтэрпрэтацыю Піліпчуком песьні пра Лявона (На папасе). Песьня гэтая — жывая гісторыя прабуджэньня грамадзкае й нацыянальнае сьведамасьці ды барацьбянага духа ў волата Лявона, сымбалізуючага беларускі народ. Ад палажэньня прыгоннае скаціны народ гэты падняўся на агульначалавечую роўню і пачаў барацьбу не на жыцьцё, а на сьмерць, за сваю волю і права на чалавечае існаваньне. Песьня Лявона будзіць масу, уздымае дух і кажа аб непераможнасьці Лявона: хоць аднаго заб’юць, хоць ён ляжа ў магілу, барацьба будзе трываць далей, бо — „Лявоны ў нас не пазводзяцца!“ І гэту песьню Піліпчук фальшуе: вырваўшы радок аб тым, як нясьведамы йшчэ Лявон першы раз пачуў з розных бакоў крыкі, „што ён дурань, жыве пабыдлячаму“, Піліпчук імпутуе і Купале, і беларусам, што яны... самі сябе лічаць быдлам!—Урэшце сьцьверджаны Купалам *з болем сэрца* факт пакорлівасьці беларусаў, якая давяла іх да *запраўды* жахлівага палажэньня, Піліпчук называе... прадметам „нацыянальнае амбіцыі“ беларускага „führera“ (Піліпчук у гэтым слове вельмі-ж ужо засмакаваў!). А ў выніку ўсяго гэткага фальшу пазваляе сабе зрабіць бязглуздую заяву, што нібы-то ў Купалы „паяўляецца маральнае здаваленьне, калі бачыць свой народ пераможаным і заняпалым“...

Здавалася-б, што пасьля гэтага далей па гэтай дарозе гэтаму асабліваму „крытыку“ нашага нацыянальнага паэта йсьці няма куды. Аднак, ён мае: відаць, за тое, што Купала жыве і працуе ў Савецкай Беларусі, Піліпчук ізноў кідае паэту ілжывы закід, што быццам той „зварочваецца толькі да беларусаў на гэты бок Сьвіслачы, дыплёматычна замоўчваючы, што ёсьць яшчэ „бацькаўшчына“ і на іншы бок“. Але-ж большая частка вершаў Купалы (апрача малога зборнічку „Безназоўнае“, відаць, няведамага Піліпчуку), а перадусім — *усе* тыя вершы, аб якіх Піліпчук успамінае, напісаны да ўтварэньня Савецкага гаспадарства — у тыя часы, калі ўся Беларусь, непадзеленая, была пад уладай Расеі! Дык „стрэл“ Піліпчука ізноў пападае ў пустое месца — таксама, як і ўсе ранейшыя.

Ня будзем тут пераказваць усіх недарэчных развежаньняў аб Купале фальсыфікатара ягоных ідэалаў: гэта заняло-б лішне многа месца. Адзначым толькі, што *запраўдныя* ідэалы, якія Купала выказвае ў сваіх вершах, *дужа добра ведамы Піліпчуку*, але аб іх ён гаворыць роўна ў... 26 радкох, пад той час, як разгляд сфальшаваных ім самым ідэалаў нашага паэта займае ў „Вістніку“ ажно восем старонак. У гэтых 26 радкох успамінае Піліпчук і заклікі Купалавы „наперад па шчасьце!“ (Вялікдзень) і жаданьне, каб ускрэсла Беларусь (Хрыстос уваскрос!), і цэлы рад іншых (Навагоднія жаданьні, Лета, Прарок, Папросту). Сьцьвярджае і тое, што Купала фактычна-тыкі кліча беларуса „кінуць

сьлёзны пагляд", але тут-жа паўтарае сваю выдумку, быццам Купала „перш" заклікаў „заліваццa сьлязою з ахвотай". Урэшце, на падставе *толькі шасьцёх* несфальшаваных вершаў Купалавых мусіць „гэты крытык" *прызнаць веліч ідэолёгіі Купалы:* „На гэткія вышыні — піша Піліпчук — можа падняцца толькі сэрца, якое рвецца ад болю за свае крыўды, але не падымецца ніколі дуплявае; і калі Купала на хвіліну глянуў у чысьцец, дык мы пачулі ня нуднае квіленьне падстрэленага птаха, а лятуценьні волата". Бо-ж Купала, каторага Піліпчук сьпярша так ганебна сфальшаваў дзеля сваіх палітычных мяркаваньняў, ёсьць запраўды волат; — бо ўся ягоная паэзія — гэта бязупыннае кляйменьне ад'емных бакоў беларуса і кліканьне яго да барацьбы за волю, да тварэньня несьмяротных цэннасьцяў нацыянальнае культуры, — кліканьне на сонечныя „арлiныя шляхі". Бо тая запраўдная *нацыянальная рэвалюцыя,* якую пераржыў беларускі народ ад выбуху палітычнае й сацыяльнае рэвалюцыі ў Расеі, адбылася ў значнай меры іменна дзякуючы *псыхолёгічнай падгатоўцы,* зробленай паміж іншым і творчасьцяй Янкі Купалы! — Дык *злая воля* Піліпчука, які адважыўся сваю руку падняць на нашага песьняра, выяўлена гэтак да канца.

Паганьбіўшы, як мы бачылі, ідэолёгію і Купалы, і беларусаў наагул, Піліпчук процiўстаўляе нам — украінцаў. Але-ж і ў украінскай паэзіі знойдзем усё тое, за што бічуе ён Купалу! Купала-ж найбліжэй стаіць не да Кальцовых, Некрасавых ці Нікітіных, або іншых расейскіх паэтаў, а якраз да *украінскага* нацыянальнага песьняра *Тараса Шэвчэнкі.* Бо-ж і ў Шэвчэнкі знойдзем мы тыя самыя думкі, якія трапляюцца ў Купалы і выклікаюць нездаваленьне ў Піліпчука:

Як-бы з кім сесьці, хлеба зьесьці,
Прамовіць слоўца, дык тады-б
Хоць-бы сяк-так на гэтым сьвеце
Было магчыма нeяк жыць.
(„Кобзар", стар. 225*)).

Піліпчук мусіў-бы з гэтых радкоў, згодна з сваімі „крытычнымі мэтадамі",зрабіць забойчы для Шэвчэнкі вывад... аб поўным здаваленьні „Бацькі Украіны" жахлівым жыцьцём украінскага сялянства ў часы прыгону! — У іншым месцы (Малітвы, стар. 212) Шэвчэнка, як і Купала, гаворыць:

Працоўным рукам,
Працоўным умам
Пералогі гараць.
Думаць, сеяць, ня ждаць —
І засевы зжынаць —
Працоўным рукам...

І тут быў-бы пошар для „Піліпчукоў", калі-б пад гэтымі радкамі стаяў подпіс: Купала. . А ўжо верхам „праступнасьці" з Піліпчуковага гледзішча мусяць быць словы ўпекі, кіненыя Шэвчэнкам сваей, нацыянальнай, украінскай казацкай старшызьне:

*) Цытуем паводле львоўскага выданьня „Кобзара" з 1914 году — „Саюзу Вызваленьня Украіны".

Вашы слаўныя Бруты
Рабы, падножкі, гразь Масквы,
Сьмяцьцё варшаўскае...

бо, калі маскоўскія цары руйнавалі Украіну, дык

...мы глядзелі і маўчалі
Ды моўчкі чухалі чубы,
Нямыя, подлыя рабы...
(стар. 17, 18).

А вось Піліпчук „не разумее“, чаму гэта „Купала раз багаславіў, а раз кляў свой народ, калі гэты об'ект пераставаў быць вартым спогаду“. Відаць, свайго нацыянальнага павадыра Піліпчук гэтак сама „добра“ разумее, як і Купалу. Бо-ж горкі дакор Купалы, кінены бязьдзейным і пакорлівым братом сваім:

Вам — пакорным рабам — не вясны
Рукі накрыж злажыўшы чакаць,
А пад гоман паўночнай зімы
Ямы ў полі сабе будаваць!...

лічыць Піліпчук... „нацыянальным ідэалам“ Купалы!

Канцавыя радкі стацьці Піліпчука даюць адказ на пытаньне, чаго-ж у канцы канцоў хоча гэны „крытык“ ад беларускага нацыянальнага паэта, каторы, як ведама кожнаму граматнаму беларусу, сваімі вершамі ўсьцяж будзіў — дый збудзіў! — прыспаны дух у нашым народзе, клікаў беларусаў да барацьбы за волю і вялікія ідэалы чалавецтва, зваў „да сонца і да зор“, да „красы і свабоды“? Піліпчук хоча таго, каб Купала перастаў быць беларусам-*чалавекам* ды стаўся беларусам-*зьверам!* І беларусы — на ягоны пагляд — толькі тады мо' зробяцца (хоць не напэўна!) нечага вартымі, калі — па „кароткім супрацоўніцтве“ з украінскімі прадстаўнікамі зьвярынае ідэолёгіі — свае нацыянальна-людзкія ідэалы заменяць на „здаровыя“ прынцыпы барацьбы за існаваньне свайго *гатунку,* — ясна-ж *гатунку зоолёгічнага, зьвярынага.*

Дзіўна крыху, што ўкраінская дэмакратычная прэса дагэтуль на пасквіль Піліпчука аніяк не адгукнулася. А мо' ў вачох украінскага грамадзянства „свае“ фашысты прадстаўляюць такое-ж непаважнае зьявішча, як у нас — беларускія фашысты, і на падобныя выпады „Вістника“ яно ня лічыць патрэбным зварочваць увагу?

С. КАЛІНА

Літаратура ў ваадносінах да жыцьця*)

Літаратура дзякуючы некаторым сваім спэцыфічным асаблівасьцям зьяўляецца больш зьвязанай із рэальным жыцьцём, з яго рознымі праявамі і працэсамі, чымсьці нейкая іншая галіна мастацтва. Канкрэтная запраўднасьць, якая служыць за матарыял-сырэц для кожнага мастацтва, у літаратуры бывае менш здэформаванай і знаходзіць найбольш багатае й беспасярэднае адбіцьцё. Дзеецца гэтак перадусім дзеля таго, што літаратура, карыстаючыся найбольш дасканалым спосабам артыстычнага выражэньня —*мовай,*—мае шмат шырэйшыя магчымасьці дзеля перадаваньня значэнёвага й эмоцыянальнага зьместу, чымсьці напрыклад музыка, малярства, скульптура і г. д., якія конкрэтызуюцца пры помачы адпаведнай гармоніі гукаў, хварбаў, ценяў, хвормаў і г. п.

Разважаючы аб узаемнай сувязі літаратурнага мастацтва із запраўднасьцю, высоўваюцца перад намі тры асобныя пытаньні: *1. Якія існуюць адносіны паміж запраўднасьцю, узятай беспасярэдна з жыцьця, а яе адбіцьцём у літаратурным творы, 2. Якое становішча займае літаратура адносна рэальнага жыцьця і які можа мець на яго ўплыў і 3. Ці могуць быць крытэрыі артыстычнай ацэны літаратурнага твору з гледзішча ўсяго толькі на яго тэматыку, аснованую на жыцьцёвым матарыяле?* Кожнаму з гэтых надзвычайна цікавых і актуальных сяньня пытаньняў прысьвяцім жменю ўвагаў, выказываючы іх на падставе адпаведных зьявішчаў у беларускай літаратуры.

1.

Сапраўднасьць а літаратура

Часта маем звычай глядзець на зьявішчы й факты, апісаныя ў літаратурным творы, як на праўдзівы й точны дакумэнт зьявішчаў і фактаў, якія мелі месца ў запраўдным жыцьці. Само сабой зразумела, што не адносіцца гэта да тых твораў, да якіх чытач пераканаеы, што адмаляваныя ў іх здарэньні зьяўляюцца чыстай выдумкай, плодам творчай фантазіі песьняра. На такія творы глядзіць кожны, як на артыстычную містыфікацыю, якая толькі ў сваіх аснаўных асаблівасьцях мусіць быць згодная з жыцьцёвай лёгікай. Але справа прадстаўляецца заблытанай,

---

*) У гэтым артыкуле закранаем усяго толькі найважнейшыя пытаньні, якія адносяцца да вельмі шырокай і ў многіх прыпадках спорнай яшчэ квэсты ўзаемных адносінаў літаратурнага мастацтва й рэальнага жыцьця. Кідаючы гэтыя фрагмэнтарычныя ўвагі, — якія, дзякуючы гэтай-жа „фрагмэнтарычнасьці,“ не заўсёды арганічна з сабой вяжацца, — мелі мы наўвазе зьвярнуць на іх увагу нашага грамадзянства, якое незаўсёды належна разумее й ацэнівае розныя літаратурныя зьявішчы.

калі дадзены літаратурны твор зьяўляецца аснованы на нейкім здарэньні ці факце праўдзівым. А трэба ведаць, што літаратурны кірунак, званы „аўтэнтызмам,“ які характарызуецца апісываньнем зьявішчаў і фактаў праўдзівых, у той ці іншы спосаб знаных аўтару і ім перажытых, ёсьць сяньня модным і актуальным. Дзякуючы гэтаму, чытач стараецца часта шукаць у літаратурным творы дакладнай копіі фактаў ці здарэньняў, якія адбываліся ў запраўднасьці, а на падставе лірычнае паэзіі адтварае сабе із стопрацэнтнай дакладнасьцю ўласныя думкі, перажываньні й пагляды песьняра, ня могучы яму даравяць, калі часамі адмаляваньне нейкага фрагмэнту жыцьця ўва ўсім і ня ўсюды згаджаецца з праўдай. Такі падыход да твору, зьяўляецца, ясна-ж, фальшывым і асновываецца на неразуменьні істоты літаратурнага мастацтва.

Ужо ўспаміналася, што літаратура, як і кожнае іншае мастацтва, чэрпае матарыял із канкрэтнага жыцьця, адбівае ў сабе, як у люстры, розныя жыцьцёвыя праявы і працэсы, надаючы ім апрычонае артыстычнае выражэньне. Жыцьцёвыя зьявішчы і факты, паказаныя ў літаратурным творы, дзякуючы іх артыстычнаму ператварэньню, ня могуць быць ідэнтыфікаваныя з запраўдным жыцьцём, бо зьяўляюцца заўсёды здэформаванымі паводле мастацкай лёгікі, твораць свайго роду міт альбо артыстычную візію. Ніякі літаратурны твор, хоць-бы ён быў прысьвечаны апісаньню нейкага праўдзівага здарэньня, добра знанага аўтару, ніколі ня зможа яго прадставіць з навуковай точнасьцю і з захаваньнем усіх яго аўтэнтычных асаблівасьцяў. Паэт ці пісьменьнік, апісываючы нейкае праўдзівае здарэньне, адныя яго рысы зусім зацірае, іншыя, часамі нават менш важныя, высоўвае на першы плян, або падае іх у іншых, чымсьці ў запраўднасьці, суадносінах так у прасторы, як і часе, некаторыя з іх зьмяняе ці дапаўняе мамэнтамі выдуманымі, фікцыйнымі. Перайначываючы такім спосабам запраўднасьць, паступае аўтар згодна із сваімі артыстычнымі мэтамі, бо заданьнем ягоным ня ёсьць дакладнае і сыстэматычнае інфармаваньне чытача аб дадзеным выпадку ці здарэньні, але паказаць абраз ці апісаньне з гледзішча на яго чыста артыстычную функцыю ў творы, прадставіць яго ў форме мастацка-скомпанаванай цэласьці. Такім спосабам літаратурны твор прамаўляе да нашае пачуцьцёвасьці і фантазіі, пабуджае выабражэньне, захоплівае сваім хараством, адным словам выклікае *эстэтычныя перажываньні*, а ў ніякім прыпадку ня ёсьць ягоным заданьнем заспакойваньне нашых інтэлектуальных патрэбаў, даючы веду аб фактах.

Пры паўставаньні літаратурнага твору гуляе першую ролю творчая фантазія песьняра, якая, як ведаем, ёсьць у тым, што мы патрапляем на падставе ведамых нам зьявішчаў і фактаў тварыць візію новай запраўднасьці, тады, калі фантазія адтвараючая выклікае ў нашай сьвядомасьці ўсяго толькі зьявішчы

й факты, у той ці іншы спосаб нам знаныя. Фантазія адтвараючая зьўляецца неабходнай кожнаму чалавеку ў ягоным жыцьці, памагае яму прыпамінаць розныя знаныя здарэньні і адтварыць іх з большай ці меншай дакладнасьцю, а фантазія творчая ёсьць спэцыяльным дарам прыроды; ад яе багацьця й глыбіні залежыць у вялікай меры якасьць артыстычнага таленту. Дык і гэтая акалічнасьць выразна гаворыць за тым, што запраўднасьць, адбітая ў літаратурным творы і ператорaная дзякуючы творчай фантазіі артыста ў візію новай запраўднасьці, у ніякім прыпадку ня можа быць ідэнтыфікаванай з яе адказьнікам у рэальным жыцьці.

Дзеля цікавых разважаньняў на гэтую тэму можа даць нам многа матар'ялу *Нарач* Максіма Танка, як твор, аснованы на праўдзівых і сьвежых яшчэ выпадках з жыцьця наднарачанскіх рыбакоў, аб якіх пару год таму назад шырака пісала віленская прэса. Калі-б нават і ня ведаць зусім аб барацьбе наднарачанцаў за права да вазёр, то ўяўляючы сабе, што „Нарач" ёсьць літаратурным творам, прыгэтым творам першай якасьці, можна сьмела цьвердзіць, што не адбівае яна ў сабе дакладнага ўва ўсіх дэталях ходу барацьбы, што, побач із мамэнтамі аўтэнтычнымі, якія зьяўляюцца аснаўным фонам паэмы, многа так-жа знойдзем выдуманых і перайначаных, што іхнае прычыновае павязаньне і суадносіны будуць іншыя, чымсьці было ў запраўднасьці. Ужо той факт, што Танк наднарачанскія падзеі стараўся расшырыць на ўвесь беларускі народ і ў іх сьвятле хацеў паказаць сучаснае палажэньне і змаганьне беларускага народу, вымоўна сьведчыць, што ня мог ён агранічыцца выключна да знаных яму здарэньняў над Нараччу. Апрача гэтага, Танкава паэма прадстаўляе сама ў сабе твор вялікага эпіцкага размаху, творыць багатую і артыстычна закругленую візію барацьбы. Сьведчыць гэта аб буйнай і шырокай творчай фантазіі песьняра, якая, як ужо ведаем, ня лічыцца із запраўднасьцю, але дапаўняе і ўзбагачвае яе.

Навуковае дасьледаваньне элемэнтаў літаратурнага твору, узятых із запраўднасьці — ці гэта будуць падзеі гістарычныя, апісаныя ў творы, ці тыпы знаёмых аўтару людзей, ці фальклёрыстычныя матывы, або напасьледак апісаньні канкрэтных краявідаў і мясцовасьцяў — прадстаўляюць для літаратураведы вялікую вартасьць. На гэтай падставе можна з большай дакладнасьцю праступ'яваць сілу й характар творчай фантазіі аўтара, глыбей унікнуць у ягоны талент наагул. Было-б тады карысным, каб нехта паруліўся дакладна апісаць нядаўныя наднарачанскія падзеі дзеля іхняга сконфрантаваньня з Танкавай паэмай, пакуль яны не расплывуцца ў імгле народнае легенды. З гэтаю-ж мэтаю даўно трэба было паруліцца апісаць і сфатаграфаваць наднёманскія абразы ў Стаўпеччыне, гэтак сакавіта адмаляваныя Коласам у *Новай Зямлі*.

З гэтых кароткіх разважаньняў аб адносінах паміж запраўднасьцю, прадстаўленай у літаратурным творы, а яе канкрэтным адказьнікам у жыцьці, маглі-б паўстаць паважныя непаразуменьні, калі-б на гэтым вычарпаць нашую тэму. Калі сьцьвярджаем, што літаратурны твор ніколі не адбівае ў сабе дакладна рэальнай запраўднасьці ўва ўсіх ейных дэталях, але ператварае яе свабодна, згодна з законамі мастацтва, у запраўдасьць фікцыйную, то маглі-б насувацца сумлевы, ці наагул ёсьць патрэбным лічыцца з жыцьцёваю праўдаю ў літаратурным творы і ці не выгадней было-б з неагранічанаю свабодаю паслугоўвацца фактамі й здарэньнямі, узятымі з жыцьця, зусім не аглядаючыся на ступень іхняе праўдзівасьці?

Вось-жа трэба асабліва моцна падчыркнуць, што гэтая свабода, з якой аўтар адносіцца да рэальнага жыцьця, мае свае межы, якіх пераступіць нельга. Гэтак прыкладам у ведамай трагэдыі Шэксьпіра *Юлі Цэзар* бачым старасьвецкіх Рымлян, якія ходзяць у капялюшох, чуем, як у хатах рымскіх патрыцыяў б'юць на сьцяне гадзіньнікі, калі ведаем, што ў тыя часы, у якіх разгортваецца акцыя трагэдыі, гадзіньнікі ня былі яшчэ ведамыя і што Рымляне капялюшоў не насілі. Зусім зразумела, што гэтыя анахранізмы ў выдатным шэксьпіравым творы, незацемленыя аўтарам, зьяўляюцца артыстычнай заганай. Было-б таксама недарэчным, калі-б напрыклад Колас у *Новай Зямлі,* кідаючы агульны абраз Вільні із Замкавай Гары, перанёс касьцёл сьв. Пятра й Паўла з Антокаля на Лукішскі пляц альбо калі-б Міхась Машара ў паэме аб Кастусю Каліноўскім пакінуў пры жыцьці свайго героя, калі ведаем із гісторыі, што быў ён асуджаны на сьмерць і што прысуд быў выкананы.

Адсюль вынікае, што вернае прадстаўленьне агульназнаных фактаў, прыгэтым фактаў аснаўных, з якімі літаратура мусіць лічыцца, а свабоднаеператварэньне запраўднасьці ў літаратурным творы, аб чым была мова вышэй, гэта дзьве зусім розныя рэчы, якіх ідэнтыфікаваць нельга. Пішучы напрыклад аб Каліноўскім, немагчыма яго пакінуць пры жыцьці, бо пярэчыла-б гэта аснаўному гістарычнаму факту, затое ў прадстаўленьні паасобных акалічнасьцяў ягонай сьмерці, як і ў напісаньні некаторых этапаў жыцьця можа сьмела сабе пазволіць аўтар на рознага роду зьмены й дапаўненьні. Немагчыма нават выабразіць сабе, каб мог існаваць нейкі літаратурны твор, які-б складаўся выключна з матываў, аўтэнтычна згодных з іхнімі адказьнікамі ў запраўднасьці. Звычайна-ж матывы аўтэнтычныя, узятыя з жыцьця, прадстаўляюць усяго толькі агульнае рыштаваньне твору, якое трэба выпаўніць матывамі фікцыйнымі і павязаць іх узаемна. Нейкае праўдзівае здарэньне, якое хоча аўтар намаляваць у творы, прадстаўляе заўсёды само ў сабе іншую цэласьць, іншыя суадносіны й парадак паасобных яго момэнтаў, чымсьці патрэбна гэта артысту дзеля збудаваньня новай артыстычнай цэласьці, якая мусіць быць скомпанаваная й за-

кругленая выключна з гледзішча на яе чыста мастацкую структуру.

Паколькі літаратура не патрабуе лічыцца з жыцьцёвай праўдай, за выняткам некаторых асаблівых прыпадкаў, успомненых вышэй, патолькі павінна адказываць ейнай праўдападобнасьці. Фабула літаратурнага твору, прадстаўляючая ў сабе фікцыйны абраз людзкога жыцьця, мусіць быць згодная з вымаганьнямі жыцьцёвай лёгікі, мусіць даваць нам уяўленьне такой фікцыі, якая зьяўлялася-б праўдападобнай і магчымай у запраўдным жыцьці. Выняткам ад гэтага могуць быць фантастычныя творы, ці толькі паасобныя фантастычныя ў іх элемэнты, якія пераважна замыкаюць у сабе той ці іншы сымболічны зьмест альбо алегорыю. Аднак-жа і гэтыя апошнія ў сваім прычыновым павязаньні і суадносінах звычайна адказываюць законам, кіруючым рэальным жыцьцём.

Якнайбольшая згода літаратурнага твору із запраўднасьцю і бясспрэчная ягоная праўдападобнасьць — бяз шкоды, зразумела, для яго артыстычнай вартасьці, (бо, як часта гаворыцца, ня ўсё тое, што здараецца ў жыцьці можа быць і ў літаратуры і наадварот) — ёсьць зьявішчам бязумоўна вельмі дадатнім. І зусім зразумелыя для нас, а нават неабходныя будуць выдавацца дакладныя студыі некаторых аўтараў над канкрэтным жыцьцёвым матар'ялам, які маняцца выкарыстаць у сваіх творах. Гэтак аўтар гістарычных твораў стараецца належна пазнаць даўнейшае здарэньне ці выпадак і ўнікнуць у васаблівасьці эпохі дзеля яе больш дакладнага адмаляваньня, іншы аўтар студ'юе тыпы й псыхолёгію дадзенага сацыяльнага асяродзьдзя, стараецца захварбаваць мову сваіх герояў языковымі яго асаблівасьцямі, іншы ўзноў знаёміцца з рознымі палітычна-грамадзкімі доктрынамі маючы наўвеце паказаць іх у літаратурным творы.

Усё гэта зьяўляецца нязвычайна важнай і неабходнай рэчай, бо без дакладнага пазнаньня таго выразку жыцьця, які маніцца аўтар выкарыстаць у сваім творы, проста немагчымым быўбы добры рэзультат усей ягонай працы. Асабліва найнавейшыя кірункі літаратурнага мастацтва стараюцца як найбліжэй трымацца аўтэнтычнасьці таго жыцьця й фактаў, з якіх чэрпаюць творчы матар'ял, і, не агранічваючыся да самай тэматыкі, прабуюць, з добрым пасьпехам, расшырыць гэтую аўтэнтычнасьць на мову і стылістычныя асаблівасьці твору. Але й тутака ня можна ані на часіну забывацца, што як-бы аўтар не стараўся быць верным у артыстычнай перадачы ведамага яму матар'ялу і якбы добра яго не прасту'яваў, літаратурны твор, асновань на гэтым матар'яле, будзе ў аканчальным сваім выніку ня чым іншым, як толькі большай ці меншай мастацкай стылізацыяй пазнанага жыцьця, толькі артыстычнай візіяй запраўднасьці, а не дакладнай яе копіяй. Такі ўжо закон літаратурнага мастацтва, як і мастацтва наагул, які яго выдзяляе спасярод іншых родаў чалавечай духовай творчасьці, як галіну зусім апрычоную і поўнасьцю аўтономічную. *(д. б)*.

МІХАСЬ МАШАРА

З ЦЫКЛЮ —Ей—

Твой дзіўны сьпеў
і звон тваей гітары
Трывогай мне напоўнілі душу,
У сэрцы бунт успыхнуў зноў пажарам,
Хоць сам сабе
прызнацца не хачу.

Хачу сябе на міг замкнуць у мрою,
Хоць сэрца ў бунце скача на нажы.
Цьвярджу яму —
нашто табе такое?
Згасі агні...
зьмірысь
і ня тужы,
Пільнуй таго, што выпала на долю.
Навошта бунт?
І ласкі не прасі.
Ужо ізноў шуміць трава у полі,
Нам трэба ў песьнях сонца каласіць.

У нас з табой
ёсьць музыка другая —
Сталёвы рытм жыцьцёвай барацьбы.
Яе пяе уся зямля жывая
Ўтапіўшы ў шэрых буднях нашы дні.

Зьвіні, зьвіні,
гітары звон чароўны, —

Дзявочы сьпеў,
хвалюй мяне і муч.
Душой згараючы на шляху зорным
Аж да канца
хачу сябе жывым я чуць.

М. ШКЯЛЁНАК

Уступ да студыяў над гісторыяй Беларусі

I. Тэрыторыя Беларусі і яе дагістарычнае насельніцтва.

Пад тэрыторыяй Беларусі мы разумеем абшар заселены беларускай этнографічнай масай. Граніцы гэтай масы азначыў ужо праф. Карскі*), кіруючыся, як асновай, распаўсюджаньнем

*) Праф. Карскі, Бѣлоруссы, Вильна, 1904 г. Кн. I. бач. 4—19. Па водле Карскага граніцы Беларусі прадстаўляюцца наступна. На захадзе ад ст. Корсаўка мяжа зварачвае на паўдз.-усход да р. Сінюхі, скуль ідзе проста на захад, а ад воз. Чарза на паўн.-захад, кіруючыся да межаў б. рэжыцкага павету. Адгэтуль ідзе ламанай лініяй ізноў на паўдз.-усход да граніцы б. трох паветаў: люцынскага, себежскага і дрысенскага. Ад гэтага пункту граніца ідзе на паўдз.-захад па лініі аддзяляўшай б. дрысенскі павет ад люцынскага, рэжыцкага і дзьвінскага ў кірунку Дзьвіны да Прыдруйска (прыблізна). Далей па Дзьвіне граніца ідзе да Дзьвінска, скуль на паўн.-захад да Ілукшты. На гэтай лініі суседзямі беларусаў зьяўляюцца **латышы**.

Ад Ілукшты мяжа ідзе на паўдзён, крыху на захад ад воз. Дрысьвяты да р. Дзісны, перарэзаўшы каторую праходзе ў Сьвянцяншчыне каля літоўскіх валасьцяў Цьверычы, Гадуцішкі, Сьвянцяны і далей на захад ламанай лініяй па мяжы даўнейшага віленскага павету амаль да Кернава, каля якога пераходзе на левы бераг Вяльлі ў паўдзённым кірунку. Ад ст. Рудзішкі ідзе на паўдз.-усход і ўсход да мяжы б. лідзкага павету, скуль пераходзе ў ашмянскі павет, дзе каля Гаранава зварочвае на паўдз.-захад да Бастун і Забалацьця, а пасьля на поўнач да Эйшышак. Ад Эйшышак ламанай лініяй зварачвае на паўдз.-захад і захад да Друзгенік. Суседзямі беларусаў на гэтай лініі зьяўляюцца **літоўцы**.

Каля Друзгенік (па беларускім баку) граніца ідзе ў Сувальшчыну, займаючы частку сэйненскага і аўгустоўскага паветаў, дзе суседзямі беларусаў зьяўляюцца ўжо палякі. У Сувальшчыне граніца ідзе на Копцева да аўгустоўскага каналу, далей каналам і р. Нэтай да Горадзеншчыны. Тут граніца ідзе на паўдзён каля Сухаволі (на захад) на Кнышын, Хорашч, Сураж, да р. Нарвы. Суседзьмі на гэтай лініі зьяўляюцца **палякі**.

За р. Нарвай на паўдзён ідзе ўжо украінская мяжа па р. Нарве праз бельскі павет да Белавескае пушчы і далей па р. Нараўцы да м. Шэрашава, скуль на Пружану (па укр. баку) да Картускае Бярозы. Адгэтуль зьвяртае на паўн.-усход да р. Шчары, пасьля ідзе р. Бобрыкам на паўдз.-усход праз Лунін, Лунінец да р. Прыпяці, а пасьля гэтай ракой да Дняпра, далей па Дняпры да м. Любэча, скуль ідзе на ўсход праз м. Рэпку на Седнева. Ад Седнева граніца паварачвае на поўнач ламанай лініяй. Каля Хрэнаўкі граніца зварачвае на ўсход аж да р. Дзясны, пасьля ідзе гэтай ракой аж да б. Арлоўскае губэрні. Суседзямі беларусаў на гэтай лініі ёсьць **украінцы**.

У Арлоўскай губ. пачынаецца граніца з **расейцамі**, якая ідзе на захад ад Бранску праз Жукаўку, далей на поўнач, адразаючы да Беларусі заход-

чыстай беларускай мовы, без яе пераходных да маскоўшчыны і украіншчыны дыялектаў. Граніцы прынятыя Карскім на захадзе (з латышамі, літоўцамі і палякамі) ня выклікалі засьцярог з боку пазьнейшых дасьледчыкаў. Дыскусыя ўзьнялася толькі над маскоўскай і украінскай межамі. У рэзультаце новых і навейшых досьледаў, маскоўская і украінская межы папраўлены на карысьць беларускай этнографічнай масы*). Далейшыя досьледы могуць прынесьці нязначныя зьмены гэтых межаў у той ці іншы бок, але спадзявацца паважных перамен ня прыходзіцца. Хочучы азначыць у галоўных нарысах этнографічныя межы Беларусі, мы паклічымся тут на А. Смоліча, беларускага географа, вывады якога ня толькі ня ёсьць супярэчнымі з апошнімі досьледамі ў гэтай галіне, але цалком з імі згаджаюцца. А. Смоліч азначае этнографічныя межы Беларусі наступнымі пунктамі. Мяжа беларускага і *польскага* прастораў ідзе ад м. Мельніка па рацэ Буг, Нурцу, Нарве і Бабру на Аўгустоў; мяжа з *літоўцамі* ідзе каля мястэчкаў Друзгенікі, Рудзішкі, Еўе, Янішкі, Сьвянцяны,

---

нія часткі б. Жыздрынскага і Масальскага паветаў і пераходзіць у Смаленшчыну. У Смаленшчыне граніца ідзе ламанай лініяй па межах даўнейшых паветаў дарагабускага і бельскага. Каля Зубцава ў Цьвершчыне граніца зварачвае на паўн.-захад, ідзе на паўдзён ад Ржэва і падходзе да вытакаў Дзьвіны і Волгі, скуль кіруецца на захад.

*) Над падрабязьнейшым азначэньнем маскоўскай і украінскай межаў працавалі галоўна: **Н. Дурново, Н. Сокалаў** і **Д. Ушакоў** — аўтары „Опыта діалектологической карты русскаго языка в Европѣ съ приложеніемъ очерка русской діалектологіи". Москва, 1915, стр. 132, там-жа мапа; **І. Голанаў**: „Несколько новых данных к вопросу о географическом распространении диссимилиятивнаго акания, —Сборник статей в честь акад. А. І. Соболевскаго. А. Н. С. Ленинград 1928; **П. Растаргуеў**: „Северско-белорусскій говор. Изследования в области диалектологии и истории белорусских говоров", Изд. І.В.К Ленинград 1927, Московская Диалектологическая Коммисія; **П. Бузук**: „Да характарыстыкі паўночна беларускіх дыялектаў. Гутаркі невельскага і вяліскага паветаў", Менск, 1926; **В. Ганцаў**: „Диялектолёгична клясыфикация украинськіх говорів, Зап. Ист. Філёлёг. Виддилу У.А.Н.. Кіів. 1924 і іншыя. Апіраючыся на гэтых і іншых досьледах **др. Я. Станкевіч** усьлед за Маск. Дыялект. Камісіяй азначае ўсходнюю граніцу з маскоўшчынай гэтак: пачынаецца на граніцы б. пав. сычоўскага і зубцоўскага, далей ідзе ўздоўж ракі Вазузы, дзелячы сычоўскі павет прыблізна на дзьве роўныя часткі, потым праз вяземскі павет бліжэй да яго заходняе граніцы, далей уздоўж граніцы б. паветаў дарагабускага і юхнаўскага і праз паўн.-усх. частку б. ельнінскага уваходзе ў б. губ. калускую, ідзе тут па р. Балве, наступна ў б. арлоўскай губ. пераразае б. пав. бранскі ў паўднёва-заходнім кірунку і ўваходзе ў б. пав. трубчэўскі, у якім адразае невялікі заходні кут на карысьць чыстае беларушчыны; у б. мглінскім пав у Чарнігаўшчыне адразае невялікі ўсходні кут да пераходных беларускіх дыялектаў; уваходзячы ізноў у б. трубчэўскі павет праходзе ўздоўж яго граніцы з б. мглінскім і старадубскім паветамі і далей па р. Дзясьне. Граніца украінская на аснове тых-жа досьледаў адсоўваецца на паўдзён ад граніцы Карскага і прабягае па старой гістарычнай мяжы прыблізна па даўнейшай адміністрацыйнай граніцы б. губ. мінскай і горадзенскай з б. губ. кіеўскай і валынскай (J. Stankiewicz: Stan badań nad klasyfikacją djalektów języka białoruskiego. Balticoslavica, T.II, б. 122—126. Тут-жа аўтар рачова аналізуе вывады вышэй успомненых і іншых дасьледчыкаў).

Езяросы (б. Нова-Александраўск). Ад Езяросаў пачынаецца мяжа з *латышамі*, якая ідзе каля м. Ілукшты, Вышкаў, Люцына да ст. Корсаўкі. Ад Корсаўкі пачынаецца мяжа з *Расеяй*. Яна ідзе каля м. Апочкі, Вялікіх Лукаў, вярхоў Дзьвіны на Ржэў і Зубцоў, скуль зьвяртае на паўдзён і па верхнім Дняпры ідзе аж да Дарагабужу. Каля яго мяжа паварачвае крыху на ўсход, а пасьля ідзець ізноў у паўдзённым кірунку на Бранск, скуль р. Дзяснoй да м. Грамяча. Каля Грамяча пачынаецца беларуска-*украінская* мяжа, якая дзелячы Чарнігаўшчыну больш менш папалам кіруецца на Любеч. Ад Любеча граніца ідзе уніз па Дняпры да утокаў Прыпяці і там трапляе на старую беларуска-украінскую гістарычную мяжу, якая лясамі і балотамі на паўдзён ад Прыпяці ідзе больш менш па даўнейшай граніцы менскае і горадзенскае губэрніяў з кіеўскай і валынскай прыблізна да Уладавы, пасьля па рацэ Бугу да Мельніка*).

Гэты прастор займае 300.000 кв. вёрст і цягнецца з усходу на захад каля 700 вёрст і з поўначы на паўдзён каля 550 вёрст**).

Цяперашнія этнографічныя граніцы Беларусі не пагаджаюцца з тымі, якія займаў беларускі народ у працягу гісторыі, паіменна цяперашнія межы ёсьць значна меншымі ад гістырычных. Звужэньне межаў наступіла дзякуючы стратам на ўсходзе, паўдз.-усходзе і поўначы ў землях, занятых даўней беларускімі плямёнамі Вяцічаў, Северанаў і часткава Крывічоў (Пскоўшчына). Страчаныя землі гэта тыя, якія цяпер лінгвісты азначаюць як занятыя пераходнымі беларускімі гаворкамі. Сяньня трэба лічыць ужо даказаным, што гэтыя пераходныя гаворкі паўсталі на беларускай аснове, хоць яшчэ нядаўна некаторыя расейскія філёлёгі (Шахматаў і інш.) бачылі тут расейскую аснову***).

Калі на поўначы, усходзе і паўдні абшар заняты беларускай этнографічнай масай зьменшыўся, на захадзе мяжа з літоўцамі і нават латышамі перасунулася на карысьць беларусаў. Шляхам калянізацыі пушчы, аддзяляўшай балтыцкія плямёны ад беларусаў, або нават асыміляцыі суседніх балтаў, граніцы беларускае мовы пасунуліся тут крыху далей на захад.****) Бясспрэчнай хіба ёсьць рэчай, што гісторыя Беларусі не павінна абмяжавацца толькі да сучаснае яе тэрыторыі, але павінна наўперад прыймаць пад увагу г. зв. гістарычныя межы беларуска-

---

*) А. Смолiч. Географія Беларусі, выд. 3. Вільня, Віл. Выд. Клецкіна, б. 145—146.

**) Ibidem, б. 4.

***) Я. Станкевіч, o. c. і ягож „Беларускія плямёны і іхняе разсяленьне". Родная мова, № 1-2 і 3-4, 1930 г. 1930 г. Вільня. У гэтых працах аўтар грунтоўна даказаў беларускую аснову пераходных гаворак. Але апрача філёлёгічных ёсьць і гістарычныя аргумэнты на карысьць беларускае асновы, да чаго мы яшчэ вернемся.

****) Існаваньне пушчы між балтамі і беларусамі, калянізаванай з абыдвух бакоў дапушчае і Лаўмянскі. — H. Łowmianski. Studia nad początkami społeczeństwa'i państwa litewskiego, t. I. б. 50-56 Дапушчэньне гэта ёсьць надта праўдападобным.

га народу і выясьніць той гістарычны працэс, шляхам каторага беларусы апынуліся ў цяперашніх этнографічных межах. З гэтага гледзішча гісторыка павінны цікавіць аднолькава побач з бясспрэчнай беларускай тэрыторыяй так-жа тэрыторыі даўнейшае Севершчыны, зямлі Вяцічаў, Пскоўшчыны, бо землі гэтыя былі населены беларускімі плямёнамі, трапіўшымі ў сілу асаблівых умоваў у сфэру палітычнага жыцьця небеларускіх цэнтраў і адыйшоўшымі праз гэта ад агульна-беларускае цэласьці.

Лішнім было-б даказваць, якое вялізарнае значэньне ў жыцьці народу маюць фізыёграфічныя ўмовы краіны, дзе ён жыве. Гэта ёсьць праўда агульна-ведамая і ня мыляючыся можна сказаць, што ня толькі культура матарыяльная, але псыхіка і агулам культура духовая народу ў значнай ступені залежыць ад прыродных умоваў, у якіх ён жыў і жыве. Характэрызуючы коратка фізыёграфічныя ўмовы Беларусі на працягу гісторыі, трэба сказаць, што яны зводзіліся галоўна да трох дзейнікаў, каторымі былі: *лес, вада і балоты.* Ад найдаўнейшых часоў тэрыторыя Беларусі была пакрыта вялізарнымі лясамі-пушчамі, даваўшымі добрую здобыч зьвярыны каляністу і спрыяўшымі разьвіцьцю бортніцтва. Апрача таго лясы ды балоты хавалі насельніцтва ад нападаў ворагаў і перашкаджалі апошнім свабодна рухацца па Беларусі, як гэта было ў краёх бязлесных (прыкладам Украіна). Аднак, побач з гэтым, пры надта прымітыўнай тэхніцы, лес быў вялікай перашкодай для шыбкага разьвіцьця земляробства. Калі для першабытнага асадніцтва лес прадстаўляў хутчэй няпрыязны дзейнік, дык вада для яго была бязумоўна дадатным элемэнтам. Вада мела значэньне камунікацыйнае, была багата рыбай і па яе берагох былі натуральныя лугі, дзе затрымліваліся першыя асаднікі. Гэтыя лугі згулялі ў Беларусі тую-ж ролю, як абшары лёсу ў Сярэдняй Эўропе, паіменна прынялі найстарэйшае асадніцтва, якое пасоўвалася найахватней вадзянымі шляхамі і стабілізавалася ў вадкрытых мясцох, старонячыся няпрыязных гушчаў. Асядаючы над берагамі рэк, на краях спрадвечных лясоў, першыя каляністы паступова углыбляліся ў пушчу, цярэбячы дарогі для земляробаў, каторыя пачалі яе карчаваць. Аднак і земляроб асядаў пачаткава над ракой, дзе меў прыродныя лугі і без вялікага труду мог араць зямлю і павялічваць яе коштам лесу.

Прыродныя ўмовы Беларусі будуць больш зразумелымі, калі мы ўспомнім рэзультаты гэолёгічных досьледаў ейнае тэрыторыі.*)

З гледзішча гэолёгічнага тэрыторыя Беларусі мае сваю цікавую гісторыю. Характэрным ёсьць факт, што ад найдаўнейшай эпохі — *архэйскай* — на тэрыторыі Беларусі ня было значнейшых горатворчых працэсаў, а наглядаліся толькі дужа памальныя падняцьці і апусканьні асобных частак — г. зв. *эпірогэнэ-*

*) Глядзі H. Łowmianski, o.c. б. 50—56.

тычныя рухі. Дзякуючы апошнім простор Беларусі некалькі разоў да пасьляледавіковае пары залівауся морам і аслабаняўся ад яго. Досьледы сьцьвярджаюць, што ўжо ў *кэмбрыйскую* пару блізу ўсю Беларусь заліло мора, прыйшоўшае з захаду. Гэта мора трывала праз усю *сылюрскую* эпоху, у канцы якой паверхня Беларусі пачала падымацца з усходу і памалу ўся Беларусь выйшла з пад вады. У другой палавіне чарговай *дэвонскай* эпохі мора ізноў находзе на Беларусь, але гэтым разам з паўночнага усходу (г. зв. Ціманскае мора), залівае паўночна-усходнюю частку Беларусі і трывае там амаль да канца *вуглявой* пары. Толькі ў канцы гэтай пары ўся Беларусь робіцца *сухаземлем.* Сухасьць клімату не дала магчымасьці вытварыцца ў Беларусі значнейшым пластам каменнага вугальля. Праз цэлы шэраг наступных гэолёгічных пораў (пэрмскую, трыяс, юра). Беларусь астаецца сухаземлем. У *крэйдавую* пару мора ізноў залівае Беларусь з захаду і займае паўдзённа-заходнюю частку прыблізна да р. Бярэзіны і Вяльлі і трывае да канца гэтае пары. У гэтым часе асядаюць пласты пішучае крэйды. Паўночна усходняя частка Беларусі астаецца ў гэтую пару сухаземлем. У наступную *нумулітычную* пару (олігоцэн) ўся Беларусь ізноў заліваецца морам, прышоўшым гэтым разам з паўночнага ўсходу, але ўжо ў канцы гэтай пары морааканчальна аслабаняе тэрыторыю Беларусі. У навейшыя (чацьвёртарадныя) часы ў Беларусі таксама адбываюцца эпірогэнэтычныя рухі, але даволі слабыя і ня змогшыя зьмяніць прастораў, занятых сухаземлем і вадой. У рэзультаце гэтых рухаў паўночная Беларусь крыху паднялася, а паўдзённая зьніжылася. Трэба аднак зацеміць, што да падыймаўшыхся прастораў належыць і паўднёвы пояс узгор'яў, што цягнуцца ад Ваўкавыска праз Наваградак за Слуцк.

Сучасную сваю паверхню і яе структуру Беларусь заўдзячвае ледавіку. Шмат тысячаў гадоў назад уся тэрыторыя Беларусі пакрываецца ледавіком, прыпоўзшым сюды з поўначы і прынёсшым з сабой многа каменьняў, пяску і гліны (морэна). Калі ледавік растаяў, усю паўдзённую Беларусь пакрыла вялізарнае возера, г. зв. *Гэродотавае* мора, з якога лішкі вады сьцякалі праз Польшчу і Нямеччыну ў Нямецкае мора. Гэта возера паступова высыхала і сяньня маем толькі малыя яго астачы (возера Князь, Выганоўскае на Палесьсі і інш.). Ледавік пакінуў за сабой пласты, пад якімі ў глыбіні ляжаць іншыя, што сфармаваліся ў ранейшыя поры.*)

Паводле формаў паверхні тэрыторыя Беларусі прадстаўляе фактычна *нізіну,* пакрытую, асабліва на захадзе і паўночным усходзе, шырокімі грамадамі узвышшаў. Тыповымі нізінамі зьяўляюцца *полацкая і палеская.* З узвышшаў на захадзе трэба ад-

---

*) А. Смоліч. Географія Беларусі, Вільня, 1923 г. выд. 3, бач. 12—20. Глядзі так-жа Siemiradzki. Geologja Ziem Polskich, Wołłosowicz — Litwa i Białoruś.

цеміць наступныя іхнія грамады: *Вялейскую Падкову Узгор'яў* (у вадазборніку Вяльлі), *Паўднёвы Ланцуг Узгор'яў* (на паўдзён ад Нёмана), *Паўночныя Марэны* (між якімі плыве Дзьвіна) і *Дняпроўскае Узгор'е* (на паўдзён ад верхняга Дняпра і далей на захад). Уздоўж усходняй мяжы Беларусі цягнецца плоскае узвышша — *Вокаўскі Лес**)

Усе важнейшыя рэкі Беларусі стварыліся не раней, як у ледавіковую пару**). Беларусь абыймае верхнія часткі вадазборнікаў *Дняпра, Нёмана і Дзьвіны.* Найвялікшай ракой Беларусі ёсьць Дняпро. Гэта надта важная гістарычная артэрыя Беларусі. Галоўныя яго прытокі на тэрыторыі Беларусі: з правай стараны — *Воп, Хмосьць, Друць, Бярэзіна і Прыпяць,* з левае—*Сож і Дзясна.* Другой ня менш важнай артэрыяй была *Дзьвіна.* Найважнейшымі яе прытокамі ёсьць з правага боку: *Таропа, Усьвят, Вобаль, Палата і Дрыса,* з левага—*Мяжа, Каспля, Вула, Дзісенка.*

Урэшце Нёман ёсьць трэцяй ракой Беларусі вялікага значэньня. Найважнейшыя яго прытокі: з левага боку — *Шчара, Зельва, Чорная Ганча,* з правага—*Бярэзіна, Марачанка, Вяльля.*

На поўнач ад вадазборніка Дзьвіны праз тэрыторыю Беларусі цякуць верхнімі сваімі часткамі рэкі *Лаваць і Вялікая.* У мінуўшчыне гэтыя рэкі мелі вялізарнае значэньне. Яны належалі да г. зв. вялікага воднага шляху „із Вараг у Грэкі," праходзіўшага далей Дзьвіной і Дняпром праз тэрыторыю Беларусі. Па р. Лаваці ішоў гандаль з Ноўгарадам, а па Вялікай з Псковам, а далей па аднэй і другой — з замор'ем.

Беларускія рэкі ў гісторыі згулялі вялізарнае значэньне. Апрача падчыркненае вышэй іхняй камунікацыйнай ролі пры пашырэньні колёнізацыі, рэкі Беларусі былі вялікімі гандлёвымі шляхамі. Беларусь ляжала на скрыжаваньні двух вялікіх водных шляхоў. Першым з іх быў ужо успомнены „із Вараг у Грэкі," які лучыў поўнач з паўднём і ішоў Дняпром, Касплей, Дзьвіной, Лавацьцю або Вялікай. Другі лучыў усход з захадам і праходзіў Дзьвіной, Волгай або Дняпром. На тэрыторыі Беларусі знаходзіліся г. зв. „волакі" — сухаземныя дарогі, па якіх перавозілі тавары ад аднае ракі ў другую, быўшыя істотнай часткай вялікіх шляхоў. Над рэкамі Беларусі ад заранньня гісторыі народу бачым вялікія і сільныя гарады: *Полацак, Смаленск, Віцебск, Пінск, Тураў* і інш. — быўшыя гандлёвымі цэнтрамі Беларусі. Аб вялічыне тагачаснага беларускага гандлю сьведчаць раскопкі, асабліва апошніх часоў. Як даказаў праф. Шчакаціхін, Беларусь нават да пачатку сваей эры была ў надта ажыўленых гандлёвых зносінах з гэткімі краямі, як Пэрсыя, Сырыя, Грэцыя,

---

*) А. Смоліч, о. с. б. 21—40.

**) Ibidem, б. 55.

Скандынавія, Нямеччына, Вугрыя*). Ня трэба падчырківаць, што гэты гандаль ішоў успомненымі шляхамі.

Найвялікшым балотам на тэрыторыі Беларусі ёсьць Палесьсе. Побач з іншымі, яно ледавіковага паходжаньня. Часткава балоты могуць паходзіць ад высыхаючых вазёраў. У мінуўшчыне Палесьсе было натуральнай граніцай на паўдні, труднай да пераходу.

Пазнаёміўшыся з абшарам Беларусі, яе гэолёгічнымі і фізыёграфічнымі умовамі, паўстае пытаньне, ці тэрыторыю Беларусі можна разглядаць у гісторыі, як нейкую фізычна-гэографічную суцэльнасьць, розную ад суседніх. А. Смоліч з гледзішча будовы паверхні Беларусі, яе расьліннасьці, натуральных межаў, клімату, сеткі рэкаў рашуча выказваецца, што і цяпер Беларусь гэткую суцэльнасьць творыць**). З тым большым правам можна цьвердзіць, што гэткай суцэльнасьцю Беларусь была ў мінуўшчыне, калі ня было чыгункі, параходаў, тэлеграфаў, а ўвесь прастор яе ў значне вялікшай ступені быў пакрыты непраходнымі пушчамі й балотамі. Гэта суцэльнасьць рабіла з Беларусі трудны да здабыцьця край, хоць ён і ня меў выразных натуральных граніц у форме напр. высокіх гораў. Тым ня менш якраз іменна з гледзішча цэласьці гэтых фізыёграфічных умоў, тэрыторыю Беларусі асабліва ў гісторыі можна лічыць, як маючую натуральныя граніцы. Ужо праф. Карскі зьвярнуў увагу, што межы Беларусі, аддзяляючыя яе з заходу і ўсходу ідуць вялікімі вададзеламі пакрытымі лясамі і маюць характар натуральных межаў.***) У мінуўшчыне гэтыя лясы былі куды большымі і тварылі большую перашкоду для непрыяцеляў. Апрача таго яны былі больш балотнымі, як цяпер. Дык можна лічыць гэтыя лясістыя вададзелы натуральнымі граніцамі.

Аб Палесьсі, як натуральнай граніцы на паўдні, мы сказалі вышэй.

Труднасьць здабыцьця Беларусі, дзякуючы яе асаблівым фізыёграфічным варункам, была важкім дзейнікам, абясьпячаўшым арганізацыі асобных беларускіх гаспадарстваў, з якіх найвялікшымі былі Полаччына, Смаленшчына і Турава-Піншчына.

---

*) Праф. М. Шчакаціхін. Нарысы з Гісторыі Беларускага Мастацтва, т. I Менск, у розных мясцох.

**) А. Смоліч. Географія Беларусі, Вільня, 1923, б. 113—116.

***) Карскі, о. с. бач. 24–28

(*д. б.*)

Хведар Іванавіч Шаляпін

12 красавіка гэтага году скончыў сваё жыцьцё на чужыне, у Парыжы, слаўны на ўвесь сьвет расейскі мастак сьпеву і сцэны, Хведар Іванавіч Шаляпін. Правільна адзначыў нехта ў адным з нязьлічаных нэкралёгаў аб вялікім нябожчыку, што пішучы аб Шаляпіне асабліва востра адчуваеш усё бязсільле слова... Назваць вялікім сьпеваком, або нават геніяльным мастаком — усё гэта зусім не аддае запраўднай магутнай велічы, шырыні, глыбіні і яркасьці гэтага нябывала арыгінальнага, зложанага, а разам такога простага і для ўсіх зразумелага, усіх перамагаўшага сваей унутранай і вонкавай красой зьявішча... Шаляпіна трэба было чуць і бачыць. І тады слухач забываў усё на сьвеце, не забываў толькі на ўсё жыцьцё аж да сьмерці таго ўражаньня, тае радасьці мастацтва, якія даваў Шаляпін. За сваю блізу паўвяковую кар'еру мастака, Шаляпін аб'ехаў літаральна цэлы сьвет. Шматлікія мільёны людзей розных краёў, нацыяў і колеру слухалі яго, як „адкравеньне самой мастацкай красы і Божае прыроды", і абраз расейскага мастака жыве ў удзячнай памяці гэных мільёнаў, як узор дасканаласьці, як найдаражэйшы, непаўтарымы ўжо ўспамін дазнанае за жыцьця мастацкае роскашы...

Як-жа, аднак, даць паняцьце аб тым, што такое Шаляпін, тым, хто яго ніколі ня чуў і не пачуе. Праўда, голас мастака цяпер, можна сказаць, навука і тэхніка умее „запісаць" і голасна „адчытаць." Мы кажам, ясна-ж, аб *грамафоне.* На грамафонных плітках запісана блізу ўся мастацкая продукцыя Шаляпіна, як і іншых слаўных сьпевакоў сьвету. Але-ж, Шаляпін — ня толькі мастак сьпеву, але і непаўтаральны, геніяльны артыст сцэны. Яго трэба ня толькі чуць, але і бачыць. Гэній яго якраз у гэтай сынтэзе. Нават ня ў грыме, не на сцэне, але на канцэртнай эстрадзе, трэба відзець яго рухі, яго жэст, міміку яго твару, усю яго фігуру, ад якой плыве няпераможнае „обаяніе" генія... Усяго гэтага, ясна-ж, не дае грамафон, ня кажучы ўжо і аб „мэханізацыі" самага голасу і сьпеву. Для тых, што ня чулі Шаляпіна, усё тое, што скажаш аб ім, павінна выдавацца нейкай байкай. І гэта правільна. Бо-ж, запраўды, жыцьцё і кар'ера Шаляпіна ёсьць насамперш байка, цудоўная байка. І гэтую байку трэба перадусім ведаць *народу, сярмяжнаму сялянскаму народу,* ведаць кожнаму селяніну-славяніну, значыць і беларусу, бо-ж *Шаляпін — выйшаў проста і беспасрэдна з нізоў і гушчаў простага народу, з вясковай беднаты...* Вось чаму, цудоўная байка яго жыцьця, яго кар'еры і славы — асабліва і „бязьмерна—радасная" для кожнага шчырага сына народу, асабліва — народу славянскага, ці то будзе расеец, беларус, паляк, ці ўкраінец. Ці-ж запраўды ня цудоўная байка, што просты вясковы хлапчук з-пад Казані, якога яго бедны бацька ледзь здолеў аддаць „у на-

вуку" да мясцовага шаўца, якога гэты п'яніца-„вучыцель-майстра" добра што не забіў да сьмерці, толькі сілай свайго прыроднага, генія, агнём свайго запалу да ўкаханага над жыцьцё мастацтва, воляй і працай над дадзеным яму Богам талентам, стаў блізу на паўвеку на чало ўсіх сусьветных мастакоў сьпеву і сцэны, як іх некаранаваны, але прызнаны ўсім сьветам, кароль, перад якім, як перад запраўдным „монархам Божай міласьцю," схілялі галовы наймагутнейшыя валадары і князі „міру сего."

Трэба, аднак-жа, добра зразумець, у чым-жа, уласьціва, сіла Шаляпіна.

Аб тым ясна кажа сам вялікі мастак у сваей, слаўнай нязменш яго сьпеву, кніжцы, у якой ён апісаў сваё жыцьцё. *Сіла Шаляпіна ў тым, што ён зьяўляецца найлепшым „зборным тыпам," „Божым тварам" свайго народу.* Сіла Шаляпіна — ў гэтай *органічнай, неразрыўнай, глыбінна-мастацкай сувязі з народам, якога песьнятворчую душу якраз найлепш уцелясьняе вялікі мастак.* Сіла Шаляпіна — у тым, што ён як быццам сабраў у сваю мастацкую індывідуальнасьць усе найлепшыя, сонечныя рысы свайго народу, бязьмерна шырокі размах яго душы, безгранічную шыр палёў, стэпаў, рэк і лясоў яго краю. Рэшты дакнала мастацкая школа, вялікая школа Заходу, захаваўшая досьледы тысячалецьцяў культурнага разьвіцьця чалавецтва...

Добрая, запраўдная школа заўсёды вызваляе талент з яго абмежаванасьці, з яго паняволеньня прыродай, робячы яго, наадварот, пакорнай прыладай сьведамай волі артыста, прыладай бязьмежных дасягненьняў мастацтва. І абодва гэтыя мамэнты: стыхійны прыродны талент і найвышэйшая школа, што зрабіла з гэтага шчодрага дару прыроды паслухмяны інструмэнт мастака, былі ў Шаляпіна зьліты ў геніяльнай сынтэзе нячуванай красы і непераможнага „обаянія."

У Шаляпіна быў *бас* вынятковай сілы, шырыні і пекнасьці. Глыбокі, якбыццам плыўшы з сэрца, знамяніты „аксамітны" шаляпінскі бас. Гэты інструмэнт ужо сам па сабе чараваў сваім гукам. Але як цудоўна выражаў ён розныя адцені пачуцьця! Як ласкаў, як ажыўляў, як цудатворна сцаляў і ўскрашаў гукамі ласкі, любові, як паліў страсьцю, як чараваў надзеяй, радасьцю, як узрушаў да сьлёз сумам! Яго задзіўляюча-тонкія шпаркія рэчытатывы здольны былі выразіць самую тонкую іронію, дасьціпную ігру французскага „эспри." "Вільготная" мелёдычная стыхія сьпеву чулася, як у сябе на бацькаўшчыне, у галіне „бель канто" Італіі старых майстроў, якая сталася яго другой бацькаўшчынай. Запраўды-ж, можна дзівіцца, што гэта сялянскі дзяцюк далёкай казаншчыны здолеў — ня то, што так „аб'эўрапэіцца," але так пераўтварыцца то ў француза, то ў італьянца, то ў немца, пяючы іх арыі і песьні, *пры гэтым астаючыся рускім.*

Сцэнічнае мастацтва—найбольш зложанае, найбольш сынтэтычнае мастацтва з усіх іншых. Ня кажам ужо аб тым, што

для пастаноўкі на сцэне, скажам, опэры, патрэбна супрацоўніцтва — і паэзіі, і музыкі, і мастацтва (дэкарацыі) і танца, і тэхнікі (асьвятленьня і т. д.). Але возьмем толькі самога артыста. І тут акцёр-мастак — і рэцытуе словы паэта, адтвараючы створаны ім тып; далей ён адтварае музыку, створаную кампазытарам, якую трэба зьліць сынтэтычна із словам паэта. Але-ж яшчэ мастак-акцёр павінен даць сам сваей асобай жывы тып таго, каго ён іграе. Мастак сцэнічнай ігры павінен быць і мастаком грыму, характэрыстыкі... І вось, Шаляпін быў *нячуваным мастаком усіх гэтых галінаў мастацтва у дасканалай сынтэзе.*

Без канца можна пісаць аб Шаляпіне. Але трэба і скончыць. У канцы, ня можна не паўтарыць, што найвялікшая моц Шаляпіна уяўлялася ў выкананьні ім тады, калі ён *зьвяртаўся да тэй стыхіі-маткі, якая яго спарадзіла: да стыхіі рускай народнай песьні.* Як ні быў расейскі мастак багаты сваей „усечалавечым геніем," сваей многатварнасьцяй у выкананьні родных роляй, адтварэньні людзей розных часоў і народаў, але праўдная, бясспрэчная веліч і краса яго мастацтва адчувалася якраз у галіне роднага сьвету. Тут ён быў непараўнаны, непаўтарымы, непераможны.

Расейскія опэрныя арыі, песьні бурлакоў з-над Волгі, у мастацкай апрацоўцы, паміж іншым, і самога вялікага мастака — вось чым узварушаў Шаляпін найглыбей душу слухача. І гэта, зразумела-ж, таму, што ўсім гэтым блізкім і родным, дый такім балючым, такім бязьмежна-шырокім, магутным, а адначасна такім бязсільна трагічным сьветам найглыбей — найглыбей узварушалася душа самога мастака, неразрыўна, арганічна зьвязанага з гэтым расейскім сьветам...

І мы, беларусы, добра разумеем гэта. Асабліва-ж глыбака пачынаем разумець гэта, пачуўшы свайго роднага мастака-сьпевака Міхала Забэйду-Суміцкага. Культурны эўрапэец, „грамадзянін сусьвету" ў музыцы, ён робіцца чароўным, няпераможным тады, калі пяе родныя беларускія песьні...

Ул. Чэмер

АНАТОЛЬ ІВЭРС

ЦІ ТО ПЕСЬНІ?...

Ці то песьні ў пазалоце
на аўсянішчы густым?
Ці то вецер гай малоціць,
медзьдзю зьлітыя кусты?

Ці то з шумам адцьвітаньня
сэрца збуджаны парыў
запаліў зарою раньне
да вячэрняе зары?

Ці то ў сонечным прасторы
сокал хмары варушыў?
Ці то радасьць, ці то гора
накіпела на душы?

Алесь Гурло

Толькі нядаўна атрымалі мы з Савецкай Беларусі сумную вестку — 4-га лютага памёр там адзін із старэйшых беларускіх паэтаў Алесь Кандратавіч Гурло. Нарадзіўся паэт у 1892 г. у м. Капылі, у беднай сялянскай сям'і. Ад дзяцінства пазнаў і перажыў шмат гора і бяды, будучы пастушком, парабкам і іншым наймітам. Падросшы, апынуўся ў Петраградзе, гдзе працаваў фабрычным работнікам. У 1909 г. пачаў пісаць вершы, якія вызначаюцца лірычнай пачуцьцёвасьцю і шчыраю беспасярэднасьцю. Друкаваўся да 1915 г. ў „Нашай Ніве," „Маладой Беларусі" (1913 г., сш. 3) і інш. беларускіх часапісах. „У той час, калі большасьць беларускіх паэтаў у сваіх творах ў цёмных фарбах малявалі гаротнае жыцьцё беларускага земляроба, Гурло вызначаўся сваімі вясёлымі сонечнымі мотывамі, якія энэргічна клікалі да волі, да змаганьня з цемрай. Колёрыт яго вершаў — сонечнае неба бяз хмарак, птушка-арол у вышыне, а пад імі ясна - срэбны ручэй, абшар зялёных лугоў, моцны вецер і г. д., гдзе гэткая абстава кліча да радасьці і шчасьця." („Бел. жыцьцё," № 7, 1920 г.).

Перад вайной, паклікаены ў царскую армію, Гурло служа матросам у балтыцкім флоце на караблі „Забіяка." Тут напісаў шмат вершаў, у якіх марыць аб сьветлых днях, аб сіле марака, які пераможа „сустрэчных хваляў рад." — Лютаўская рэвалюцыя застае паэта на караблі. Ён прыймае ў ёй актыўнае учасьце. У восені, у кастрычніку, між іншым бярэ ўчасьце у захопе Зімняга палацу ў Петраградзе. Цяжка ранены ў грамадзянскай вайне, ён астаецца на ўсё жыцьцё інвалідам.

Найбольш плоднымі для творчасьці паэта 1921, 22, 23 гады, калі ён напісаў шмат вершаў, якія выходзяць у 1924 г. асобным зборнікам п.н. „Барвёнак," потым адна па другой выходзяць кніжкі: „Зорнасьць." „Сузор'е," „Межы" і інш. У 1937 г. напісаў новы зборнік лірыкі. Апроч лірычных вершаў Гурло напісаў вялікую аўтобіографічную паэму.

Памёр ад сухот і калецтва.

Не памылімся, калі скажамо, што скараціла век песьняра і тая жахлівая маральна-палітычная атмосфэра, той жорсткі сталінскі палітычны рэжым, які існуе пэрманэнтна у Саветах, — у Савецкай Беларусі у больш вострай форме, — і які забраў і забірае многія дзесяткі і сотні беларускіх ахвяраў, у тым ліку і з беларускага літаратурнага Алімпу.

Я. Шутовіч

Хроніка

— У Беларускім Навуковым Т-ве. Сярод дакладаў прачытаных за апошні квартал у сэкцыях Бел. Нав. Т-ва, асабліва зацікаўленьне выклікалі два: у гістарычнай сэкцыі — даклад мгра Мікалая Шкялёнка і ў языкаведнай—д-ра Я. Станкевіча. Даклад мгра Мікалая Шкялёнка аб нарадзінах гаспадарства Міндоўга меў проста рэвэляцыйны характар з увагі на выкрыцьцё і ролю ў гэтым гаспадарстве беларускага элемэнту. Др. Я. Станкевіч даў нязвычайна цікавы філёлёгічны разгляд языка дыплёматычнага пісьма рыскае рады да віцебскага князя Міхаіла ў канцы XIII ст. Язык пісьма мае ў сабе ярка выяўленыя беларускія ўласьцівасьці і паказвае, як добра нямецкія купцы, таргаваўшыя на Беларусі, ведалі беларускую мову. Гэты даклад надрукаваны ў першым сшытку „Запісаў Бел. Нав. Т-ва“.

— У Беларускім Музэі ім. Івана Луцкевіча. У пачатку красавіка віленскія музэі абвясьцілі „Тыдзень прапаганды музэяў“. У працягу тыдня адведалі Беларускі Музэй 3.450 асоб, у тым звыш ста экскурсіяў.

Лічба экспонатаў у Музэі ўсьцяж узбагачваецца новымі рэчамі і новымі вітрынамі.

— Новая спроба комасацыі Беларускага Музэю. Два гады таму назад ўлады дзяржаўнае адміністрацыі ў Вільні запрапанавалі кіраўніцтву Беларускага Музэю, каб згадзілася зьліць гэты Музэй з польскім Музэям Т-ва Прыяцеляў Навук. Тыя-ж улады прыпынілі тады невялікую дзяржаўную дапамогу Музэю, каторая йшла перад усім на аплату музэйнае кватэры ў дзяржаўным гмаху. Аднак, ані беларусы, ані польскі Музэй на гэткае зьліцьцё не згадзіліся. Справай зацікавілася Варшава, і стуль было загадана ўзнавіць Музэю дапамогу.

Цяпер-жа новая спроба комасацыі... Віленскае ваяводзтва зьвярнулася да дырэктара Беларускага Музэю гр. Луцкевіча і запрапанавала стварыць з Беларускага Музэю ды з музэйнае зборкі Літоўскага Навуковага Т-ва адзін „Рэгіональны Музэй“, як установу дзяржаўную. Гэтая ўласнасьць беларускага народу мела стацца ўласнасьцяй Польскага Гаспадарства. Гр. Луцкевічу ўлады запрапанавалі „добра платнае“ становішча кіраўніка „Рэгіональнага Музэю“.

Дзеля таго, што Беларускі Музэй ні ў якім выпадку не павінен і ня можа ўтраціць свайго нацыянальна-беларускага аблічча і сваей самастойнасьці, і лічачыся з воляй сьв. п. Івана Луцкевіча, каторы гэты плод працы ўсяго жыцьця свайго аддаў Беларускаму Навуковаму Т-ву з тэй умовай, каб з ягонае зборкі быў створаны музэй **беларускі**, а ня нейкі іншы, — гр. Луцкевіч ад зробленае яму прапазыцыі адмовіўся.

У сувязі з гэтым, як мы даведаліся, улады йзноў спынілі выдаваную дагэтуль на ўтрыманьне Беларускага Музэю дзяржаўную дапамогу.

— Гарманізацыі беларускіх народных песьняў. Слаўны украінскі кампазытар Александар Кошыц прыслаў з Н.-Іорку для Беларускага Хору Р. Шырмы ў Вільні памастацку апрацаваныя беларускія народныя песьні: „Там за садамі“ (калядка), „Ой вышла маці“, „У ва Іордане“ (калядка), „Ой п‘яна, п‘яненька“, „Гыля, гыля, мае шэры гусі“, „Ой у садзе-вінаградзе“ і „Лугам, лугам зяляненькім“ (валачобная).

Другі ня менш знаны украінскі кампазытар М. Гайворонський таксама з Н.-Іорку прыслаў свае мастацкія апрацоўкі народных беларускіх песьняў: „Гэй паехаў сын Даніла“, „О-ю-ля-лю!“ і „Замуж пайсьці трэба знаць“.

— 17-га траўня ў Літоўскім Т-ве Літаратуры і Мастацтва адбыўся вечар беларускае літаратуры, у праграму якога ўваходзілі: рэфэрат аб беларускай літаратуры ў Польшчы, прачытаны і апрацаваны др. Тумашам палітоўску, і дэклямацыі вершаў Танка, Машары, Васілька, Арсеньневай, Ільляшэвіча і інш. з ма-

ладзейшых паэтаў, Сваяка, Адважнага — із старэйшых.

— Два чарговыя вялікія канцэрты нашага слаўнага сьпевака Міхала Забэйды-Суміцкага адбыліся 8.V. у Вільні і 24.V. — у Варшаве. Як заўсёды, з вялікай удачай. У праграме іх, апроч песьняў італіянскіх, польскіх і інш., былі і беларускія народныя, горача аклясківаныя аўдыторыяй. У Варшаве арганізавала канцэрт у залі кансэрваторыі мясцовае Асьветнае Т-ве Беларусаў.

— 20.V. звольнены з ізаляцыйнага абозу ў Бярэзе Картускай, пасьля патнаццацімесячнага ў ім прабываньня, беларускі паэт Сяргей Хмара.

— 12-га чэрвеня віленскія Беларусы адзначалі ўрачыста 25-ыя ўгодкі сьвяшчэнства а. Язэпа Гэрмановіча, беларускага паэта і пісьменьніка (псэўдонім Вінцук Адважны) і а. Віктара Шутовіча. Абодва юбіляры маюць вялікія заслугі перад беларускім культурна - рэлігійным і народным адраджэньнем. Многія леты!

— Вышлі з друку кніжкі: „Лекцыі і Эванэліі на нядзелі і сьвяты“ ў перакладзе на беларускую мову Кс. А. Станкевіча і „Божае Слова“ — таго-ж зьместу плюс прамовы Кс. А. Станкевіча. Таксама вышлі з друку „Запісы Беларускага Навуковага Т-ва ў Вільні“, сшыток першы, і новы зборнік вершаў Максіма Танка п. з. „Пад мачтай“. Асобны разгляд гэтых кніжак дамо іншым разам.

— Украінскі літаратурны журнал „Назустріч“, у нумары 7—8 сёлета, надрукаваў вялікі інфармацыйны артыкул пяра Я. Шутовіча аб сучаснай беларускай літаратуры і пераклады на ўкраінскую мову вершаў беларускіх паэтаў: А. Дудара, Н. Арсеньневай, М. Лужаніна, Купалы, Танка, Машары, Васілька. У гэтым-жа нумары зьмешчаны фотографіі Машары, Танка, Арсеньневай, Васілька.

— У польскім літаратурным часапісе „Камэна“, № 8, знаходзім вершы Машары і Танка, пераложаныя дужа хораша на польскую мову рэдактарам часапісу Яворскім.

— У дзяржаўным тэатры опэры і балету ў Менску, у сакавіку месяцы, паказаны ў канцэртным выкананьні першы акт першай беларускай савецкай опэры „Міхась Падгорны“ — лібрэтто П. Броўкі, музыка кампазытара Цікоцкага. Опэра ў чатырох актах, шасьці абразох. Цікоцкі напісаў ужо музыку для 5 абразоў. У музыцы шырака выкарыстаны беларускія народныя матывы.

— Пры дзяржаўнай фільгармоніі БССР у Менску год таму назад арганізаваны мастацкі калектыў — ансамбль беларускай народнай песьні і танцу, у склад якога ўваходзяць здольныя ўчасьнікі мастацкай самадзейнасьці. Перад аўдыторыяй ансамбль выступае з кастрычніка месяца 1937 г. і ад гэтага часу да красавіка месяца сёлета даў ужо 65 канцэртаў.

— У палавіне траўня два калектывы дзяржаўнай фільгармоніі БССР — ансамбль народнай песьні і танцу і аркестр народных інструмэнтаў — выязджалі на гастролі ў Маскву, гдзе далі 12 канцэртаў.

— Гадунец дзяржаўнай кансэрваторыі ў Менску, малады кампазытар Крышнер, напісаў музыку да першага беларускага балету „Салавей“, паводле аднаіменнай аповесьці бел. сав. пісьменьніка Зьмітрука Бядулі. Аўтары лібрэтта З. Бядуля і Ю. Сланімскі. Балет складаецца із 6 абразоў і выражае барацьбу беларускага запрыгоненага сялянства ў пачатку XIX стагодзьдзя із сваімі сацыяльнымі ворагамі. Музыка балету пранітавана беларускімі народнымі мэлёдыямі. Па ходзе акцыі выконываюцца „Лявоніха“, „Юрачка“, „Мяцеліца“ і чарод хараводных танцаў.

— 15 траўня маскоўская радыёстанцыя перадавала „Дзень Савецкай Беларусі“. У праграму перадачы ўваходзіў і літаратурна-музычны монтаж. Перадача кончылася вялікім канцэртам беларускай сав. музыкі і песьні.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч і мгр. Я. Шутовіч.

Рэдактар-выдавец: мгр. Ян Шутовіч.